

**Пасажырам цягнікоў на заметку**

СТАР. 4



**Як абараніць сваё дзіця**

СТАР. 6



**Як адрозніць алергію ад прастуды**

СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 САКАВІКА 2018 г. СЕРАДА № 54 (28670)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ТАЛЕНТЫ ЗНОЙДЗЕНЫ!



Фота БЕЛТА.

**Музыканты і танцоры, мастакі і акцёры — беларуская творчая моладзь сабралася ўчора на сустрэчы з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам. У Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанні таленавітых юнакоў і дзяўчат, а таксама агледзеў выставу-прэзентацыю.**

На ёй былі прадэманстраваны творы асноўных кірункаў мастацтва. Гэта чатыры творчыя павільёны, прысвечаныя традыцыям і інавацыям у сучаснай культуры, візуальным і відовішчным відам мастацтва, харэаграфіі і музыцы. Безумоўна, свой талент нельга хаваць: маладыя творцы паказалі, на што здольныя. Кіраўнік дзяржавы з цікавасцю разглядаў тэкстыльную мазаіку «Веснікі перамен», дэкаратыўнае пано «Запавет» з выявай адной з беларускіх цэркваў. Зацікавіла Прэзідэнта і незвычайная кераміка — збан-рукамыйнік. На прэзентацыі выступілі і юныя балерыны. За фартэпіяна сядзеў малады піяніст Аляксандр Данілаў. Па просьбе Прэзідэнта ён сыграў тое, што падабаецца музыку, — твор Уладзіміра Грушэўскага. Аляксандр Лукашэнка цікавіўся ў маладых людзей іх творчымі планамі ў прафесіі.

СТАР. 2

Соф'я МІЦКЕВІЧ — зямлячка і сваячка народнага паэта Беларусі Якуба Коласа загадвае філіялам Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея яго імя на Стаўбцоўшчыне. Калегі, суседзі і сваякі Соф'і Пятроўны ласкава называюць яе гаспадыняй і галоўнай захавальніцай малой радзімы славутага песняра. А Коласава радзіма — гэта ў першую чаргу Акінчыцы, Ласток, Альбуць і Смольня.




# Захавальніца Коласавага скарбу

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Размова па сутнасці

# АБ ЧЫМ ЗВАНЫ ХАТЫНІ ЗВОНЯЦЬ СЁННЯ?

**Заўтра спаўняецца роўна 75 гадоў, як фашысцкія карнікі спалілі разам з людзьмі невялікую лясную вёсачку Хатынь пад Лагойскам. 26 хат, 149 жыхароў, у тым ліку — 76 дзяцей. 22 сакавіка, колькі б гадоў ні мінула, будзе чорнай датай у гісторыі Беларусі, бо Хатынь — гэта застылы ў вечнасці і прасторы жывы чалавечы боль, сабраны тут з усіх беларускіх вёсак, спаленых разам з жыхарамі, і гэтага нельга забыць...**

**Або ўсё ж — можна? З-за тэрміну даўнасці, з-за зменаў у прыярытэтах чалавечага быцця, з-за спроб перапісаць гісторыю, якія аказваюцца ўдалымі...**

**Ці можам мы гэтаму супрацьстаяць? Што мы павінны зрабіць, як дзейнічаць, пра што ведаць, каб Хатынь на нашай зямлі, на нашым кантыненце, на нашай планеце ніколі не паўтаралася? Менавіта так — праз прызму сучаснасці — на трагедыю беларускіх спаленых вёсак мы вырашылі паглядзець падчас круглага стала, які правялі ў рэдакцыі за некалькі дзён да гадавіны хатынскай трагедыі. У абмеркаванні ўдзельнічалі: Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, дырэктар Інстытута гісторыі НАН, кандыдат гістарычных навук, Аляксей ЛІТВІН, загадчык аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН, доктар гістарычных навук, Ірына ВАРАНКОВА, старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН, Артур ЗЕЛЬСКІ, дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», кандыдат гістарычных навук, Марыя ГАРЭЛІКАВА, вядучы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 8–9

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валяр'ян БЯСПАЛЫ, начальнік упраўлення сацыяльнай сферы і паслуг Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«На ўзроўні дзяржавы прымаюцца ўсе меры для стымулявання работы суб'ектаў гаспадарання ў сферы бытавога абслугоўвання. Летась дзейнічаў Указ № 227, якім былі выдзелены сродкі з мясцовых бюджэтаў для будаўніцтва, рамонту, рэканструкцыі аб'ектаў бытавога абслугоўвання і іх тэхнічнага пераўзбраення. На рэалізацыю мерапрыемстваў падпраграмы «Якасць і даступнасць бытавых паслуг» было накіравана з мясцовых бюджэтаў больш за BYN3 млн, і ўсё, што запланавана, засвоена. Да 2020 года запланавана накіраванне сродкаў на развіццё аб'ектаў бытавога абслугоўвання як суб'ектамі гаспадарання, так і з мясцовых бюджэтаў. Гэтая лічба складае больш за BYN21 млн. У краіне сёння налічваецца 157 відаў бытавых паслуг. Паводле даных на 1 студзеня 2018 года, бытавыя паслугі аказвалі больш як 33,7 тыс. суб'ектаў гаспадарання».*

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫІГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ТАЛЕНТЫ ЗНОЙДЗЕНЫ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стр.)*

Размову працягнулі ў зале. У сустрэчы з кіраўніком дзяржавы прынялі ўдзел каля 270 чалавек. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што часцей назірае за прадстаўнікамі мастацкай галіны збоку, «але гэта не азначае, што не чакаю высокіх вынікаў. Ваша роля ў жыцці краіны адказная. Можа, нават больш, чым вы самі гэта ўсведамляеце». Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў любым відзе мастацтва творчыя людзі дораць настрой, эмацыянальна ўзбагачаюць і фарміруюць духоўны каркас нацыі. «Гэта дастойны і адказны шлях — весці свет за сабою, узвышаючы душы і выхоўваючы ў людзях пачуццё прыгожага», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Але, як сказаў Прэзідэнт, «усе дзяржавы і нацыі перыядычна праходзяць праз выпрабаванне так званай «чарнухай». Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што спачатку мы з такім сутыкнуліся ў 1990-х гадах: «Прапаганда разбэшчанасці, скажэнне гісторыі, нецэнзурная лексіка, залішні натуралізм, сцэны жорсткасці, гвалту ў літаратуры, кіно і драматургіі не былі вынаходкай таго часу. Песімістычнае, страшнае, шакіруючае мастацтва існавала заўсёды і часта разбурала цэлыя цывілізацыі знутры».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што неабходна разумець, выбіраючы творчую прафесію: поспех — гэта не толькі авацыі і папулярнасць, але і вялікая сацыяльная адказнасць. І ад таго, якім будзе творчы лёс таленавітых людзей, залежыць будучыня краіны. «Веру, што дзякуючы вашым пошукам і поспехам Беларусь перастане быць у сучаснай культуры «тэра інкогніта», — падкрэсліў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы закрануў таксама сітуацыю, калі таленты з'язджаюць з краіны і праслаўляюцца спярша за мяжой. Такая праблема існуе, хоць у Беларусі і створаны ўмовы для старту таленавітай моладзі. «У Год малой радзімы час пераламаць сітуацыю. Адораныя людзі павінны быць вядомыя і запатрабаваныя перш за ўсё на сваёй зямлі. І, калі самі аб сабе не паклапоцімся, ніхто іншы за нас гэта не зробіць», — падкрэсліў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка пажадаў маладым знайсці дастойнае творчае амплуа і зрабіць правільны выбар, які стане пачаткам прыгожай творчай біяграфіі.

Моладзь спытала ў Аляксандра Лукашэнкі пра даступнасць музычных інструментаў, сучаснае кіно, Instagram і не толькі. Так, кіраўнік дзяржавы расказаў, што іграў на баяне, займаўся фатаграфіяй. Наконт новых інструментаў, якіх не хапае, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна аднавіць іх вытворчасць. Барысаўская фабрыка музычных інструментаў, якая выпускала вядомыя піяніна «Беларусь», была закрытая каля дзесяці гадоў таму. Добрых інструментаў сёння недастаткова, і гэтую праблему неабходна вырашаць. Таксама Прэзідэнт спыніўся на сістэме адбору, якая складваецца і ў спорце, і ў мастацтве. Талентаў не так многа, і трэба ім дапамагчы, каб не згубіць.

Зайшла размова і пра IT. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што творчых людзей ніколі не заменіць віртуальная рэальнасць. Яна можа быць толькі ў дапамогу творцы. Таксама Прэзідэнт назваў распрацоўку дэкрэта аб лічбавай эканоміцы прыкладам творчага падыходу ў сваёй працы і адзначыў, што не выключае стварэння ў Беларусі міністэрства лічбавай эканомікі.

Моладзь спытала меркаванне Прэзідэнта наконт графітыстаў і вулічных музыкаў. Кіраўнік дзяржавы сказаў, што вітае прыгожы роспіс будынкаў. А вось з вулічнымі музыкамі сам не сутыкаўся, але адзначыў, што гэта было б цікава і, праходзячы міма, ён кінуў бы манетку. Цікавіліся і меркаваннем наконт нашумелых фільмаў «Матыльда» і «Смерць Сталіна»: што важней — гістарычная праўда ці камерцыйная выгада? Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў аснове павінна быць праўда, але сучасны фільм каштуе шмат, таму і пра камерцыйную выгаду таксама неабходна думаць.

Запыталі і пра тое, ці хоча Аляксандр Лукашэнка завесці сваю старонку ў сацыяльнай сетцы Instagram. Кіраўнік дзяржавы адказаў, што, на жаль, з-за занятасці не зможа адказваць кожнаму падпісчыку, а даручаць гэта сваім памочнікам будзе не зусім сумленна. У сваю чаргу прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант расказала, што ёсць ідэя зрабіць старонку прэс-службы кіраўніка дзяржавы, дзе можна будзе дзяліцца больш нефармальнымі фотаздымкамі. Аляксандр Лукашэнка паабяцаў падумаць над гэтай прапановай.

Напрыканцы сустрэчы малады выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, уладальнік гранта Прэзідэнта Беларусі ў сферы культуры 2018 года Антон Вырва ўручыў кіраўніку дзяржавы карціну «Малая радзіма», дзе намалявана Александрыя і бачны зімні Днепр. Выходзячы з залы, удзельнікі падзяліліся ўражаннямі ад размовы і, як адзначыла студэнтка БДАМ Ганна Шчарбітава, сустрэча прайшла лёгка, у кожнага была магчымасць задаць пытанне. Таксама дзяўчына адчула неабыякавасць кіраўніка дзяржавы да культуры і адзначыла перспектывы дызайнераў у краіне, паколькі гэта непасрэдна датычыцца яе спецыяльнасці.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Падрабязнасці

# ЦЯПЕР ЁН МОЖА СТАЦЬ НАРОДНЫМ

## «Джылі» дачакаўся наплыву пакупнікоў

**20 сакавіка ўвойдзе ў гісторыю аўтамабілебудавання Беларусі як пераломны дзень у палітыцы продажу легкавых аўтамабіляў айчыннай вытворчасці для насельніцтва.**

Некаторыя чакалі гэтага дня чатыры месяцы. Вытрымалі, магчыма, не ўсе. Нехта купіў іншы аўтамабіль, нехта выкарыстаў грошы на іншыя патрэбы. Але самыя верныя штурмавалі дылерскія цэнтры Geely яшчэ ўвечары панядзелка. Учора, 20 сакавіка, калі стартавала праграма крэдытавання БПС-Ашчадбанка на куплю аўтамабіляў Geely, сюды прыходзілі людзі адзін за адным, не дазваляючы пуставаць крэслу насупраць менеджара аўтасалона або прадстаўніка банка больш за хвіліну.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Цяпер прапанавана, нарэшце, унікальная праграма фінансавай падтрымкі з боку дзяржавы для нашых пакупнікоў, — не хавала радасці **начальнік аддзела продажу «Джылі Цэнтр Мінск» Вольга ТРАСЦЯНКО.** — Да гэтага была праведзена вялікая работа, мы выпрацоўвалі механізмы аптымальнага ўзаемадзеяння з банкам, каб гэта было зручна кліенту. У першай палове дня мы прынялі дзевяць заявак, і наплыў людзей не спыняецца. Гэта сведчыць, што людзі праграму вельмі чакалі.

Прадстаўнік банка працуе ў аўтасалоне, акрамя таго, аформіць крэдыт можна ва ўсіх офісах БПС-Ашчадбанка краіны. Рашэнне па крэдыце прымаецца на працягу 1-2 дзён пасля падачы пакета дакументаў. Як правіла, даход крэдытаатрымальніка павінен быць не меншы за двайную суму штомесячнага плацяжу ў банк. Памер апошняга залежыць ад унесенага авансу і кошту аўтамабіля. Напрыклад, калі аванс складае 10 % ад кошту аўтамабіля самай дарагой камплектацыі, штомесячны плацеж можа скласці каля 380 рублёў першыя тры гады пры тэрміне крэдытавання 7 гадоў. «Для поўнай сям'і, дзе муж і жонка працуюць, гэта цалкам прымальныя ўмовы», — пракаментавала «Звяздзе» Людміла, якая афармляла ў салоне якраз такі крэдыт.

Першая машына ў «Джылі Цэнтр Мінск» была куплена 20 снежня, з таго часу і да канца лютага адзін з двух фірменных аўтасалонаў Geely ў Мінску прадаў 91 аўтамабіль, пры тым, што да 20 сакавіка фізічным асобам аўтамабілі прадаваліся на тых жа ўмовах, што і арганізацыям.

— Дзякуючы крэдытнай праграме мы плануем прырост продажу фізічным асобам каля 30 %, — падзялілася Вольга Трасцянко. — Наша задача — даць магчымасць людзям адчуць задавальненне ад аўтамабіля Geely і пры гэтым не адмаўляць сабе ў звыклых рэчах, каб нагрузка на сямейны бюджэт была мінімальная.

Крэдытная праграма БПС-Ашчадбанка на куплю аўтамабіляў Geely прадугледжвае стаўку 1,9 % гадавых першыя тры гады. Мінімальны авансавы плацеж — 10 %. Тэрмін крэдытавання — да 7 гадоў. «Умовы крэдытавання робяць не толькі даступнай пакупку, але даюць варыянты для інвеставання грошай: можна пакласці іх, напрыклад, на дэпазіт, паступова пагашаць крэдыт і атрымліваць даход ад дэпазіту. Людзі цяпер сталі лічыць свае грошы, і гэта цудоўна», — рэзюмуе Вольга Трасцянко.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## МАРК ЦУКЕРБЕРГ ЗА СУТКІ СТРАЦІЎ 6 МЛРД ДОЛАРАЎ




**Як паведамляе CNBC, акцыі Facebook у панядзелак, 19 сакавіка, упалі на 8 %. Прычынай стала інфармацыя, якая з'явілася ў выхадныя, аб тым, што кампанія Cambridge Analytica (яна вывучала перавагі выбаршчыкаў у інтарэсах кампаніі Дональда Трампа) выкарыстала даныя больш чым 50 млн чалавек без іх згоды.**

У выніку Цукерберг страціў $6,06 млрд, застаўшыся пры гэтым чацвёртым па багацці чалавекам у свеце, адзначае Bloomberg. Наперадзе яго толькі Джэф Безас, Біл Гейтс і Уорэн Бафет.

Facebook адзначала, што не мела дачынення да дзейнасці Cambridge Analytica. Тым не менш скандал пракаментавалі ў тым ліку і амерыканскія палітыкі. Сенатар Марк Уорнер, які прадстаўляе Дэмакратычную партыю ЗША, сказаў, што палітыка Facebook нагадвае часы «Дзікага Захаду».

Паралельна стала вядома аб тым, што ў адстаўку ў хуткім часе можа пайсці кіраўнік аддзела бяспекі Facebook Алекс Стамас. Нагодай сталі спрэчкі наконт таго, як кампанія прасоўвала палітычную рэкламу падчас прэзідэнцкіх выбараў у Злучаных Штатах.

## ЭКС-ПРЭЗІДЭНТ ФРАНЦЫІ НІКАЛЯ САРКАЗІ ЗАТРЫМАНЫ ДЛЯ ДАЧЫ ПАКАЗАННЯЎ

**Былы прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі ўзяты пад варту для дачы паказанняў па справе аб парушэннях пры фінансаванні палітычных кампаній. Пра гэта паведамляе Reuters, спасылаючыся на крыніцы ў судзе.**

Паліцыя Францыі затрымала Нікаля Сарказі для расследавання меркаванага незаконнага фінансавання яго перадвыбарнай кампаніі на выбарах 2007 года. Як паведамляе Le Monde, учора раніцай Нікаля Сарказі прыбыў на слуханні ў Нантэры, дзе быў узяты праваахоўнікамі пад варту. Нікаля Сарказі займаў пасаду прэзідэнта Французскай Рэспублікі з 2007 па 2012 год.

## ЯПОНІЯ ПАЧАЛА РАСПРАЦОЎКУ ЗАКАНАДАЎЧАЙ БАЗЫ ДЛЯ ЛЯТАЛЬНЫХ АЎТАМАБІЛЯЎ

**Урад Японіі пачаў распрацоўку заканадаўчай базы для выкарыстання лятальных аўтамабіляў, паведамляе ТАСС са спасылкай на міністра эканомікі, гандлю і прамысловасці Японіі Хірасігэ Сэка.**

Адзначаецца, што да вытворчасці аўто ўлады плануюць актыўна прыцягваць прыватны бізнес. «Шляхам правядзення розных кансультацый і ўжо распачатай падрыхтоўкі заканадаўчай базы мы будзем прыцягваць да распрацоўкі лятальных аўтамабіляў новых удзельнікаў з бізнесу», — сказаў Хірасігэ Сэка.

Раней Сэка адзначаў, што разглядае стварэнне такіх аўтамабіляў як адну з самых перспектыўных галін развіцця індустрыі Японіі.

## ЗОРКА ФІЛЬМА «СЕКС У ВЯЛІКІМ ГОРАДЗЕ» ХОЧА СТАЦЬ ГУБЕРНАТАРАМ НЬЮ-ЁРКА

**Папулярная амерыканская актрыса Сінція Ніксан, якая выканала адну з галоўных роляў у культавым серыяле «Секс у вялікім горадзе», заявіла аб жаданні стаць губернатарам штата Нью-Ёрк. «Я люблю Нью-Ёрк, і сёння я вылучаю сваю кандыдатуру на пост губернатара», — напісала яна на сваёй старонцы ў «Твітэры».**

Раней аб вылучэнні Ніксан паведамляла выданне Wall Street Journal. Паводле інфармацыі газеты, 51-гадовую актрысу, якая выканала ролю Міранды, на выбарах губернатара штата могуць падтрымаць ліберальныя сілы.

Ніксан у 2013 годзе працавала ў перадвыбарным штабе Біла дэ Блазіа — цяперашняга мэра Нью-Ёрка. Сярод іншых магчымых кандыдатаў на гэтую пасаду — мэр Сірак'юса Стэфані Майнэр, а таксама былы сенатар Тэры Гібсан.

Зараз штат узначальвае Эндру Куома, ён быў абраны на гэты пост у 2011 годзе. Вядома, што на будучых выбарах ён плануе балатавацца на трэці тэрмін.

■ Жыллё

## Больш за 40 % будуецца для чаргавікоў

**У студзені—лютым арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 5,5 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 546,4 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт краіны.**

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 228,9 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 41,9 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. Акрамя таго, з агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 144,8 тысячы квадратных метраў, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 118,2 тысячы квадратных метраў. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 189,7 тысячы «квадратаў», ці 34,7 % ад агульнага ўводу па краіне.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

# Стартаваў конкурс для журналістаў і блогераў

**З 20 сакавіка адкрыты рэспубліканскі творчы конкурс «(In)клюзіўны погляд» — на найлепшае асвятленне тэмы людзей з інваліднасцю ў Беларусі, арганізаваны прадстаўніцтвам ААН у Беларусі і Міністэрствам інфармацыі.**

У Доме прэсы **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** і **пастаянны каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь Санака САМАРАСІНХА** падпісалі Палажэнне аб конкурсе.

— Мы спадзяёмся на шырокі ўдзел журналістаў і хацелі б запэўніць, што гэта толькі адзін з праектаў у частцы Інфармацыйнай стратэгіі, якая была падпісана летась (маецца на ўвазе **Інфармацыйная стратэгія Рэспублікі Беларусь па паўнапраўным уключэнні (інклюзіі) людзей з інваліднасцю ў грамадства. — Рэд.**), — сказаў падчас падпісання Аляксандр Карлюкевіч.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ (злева) і пастаянны каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь Санака САМАРАСІНХА.**

— У склад журы конкурсу будуць уваходзіць як прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі і прадстаўніцтва ААН у Рэспубліцы Беларусь, так і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, якія працуюць з людзьмі з інваліднасцю, і самі людзі з інваліднасцю, — паведаміў журналістам Санака Самарасінха.

**У нашай краіне звыш паўмільёна людзей з рознай ступенню інваліднасці, і колькасць іх пастаянна расце. Нам трэба зрабіць усё, каб яны не саромеліся сваёй інваліднасці і не адчувалі сябе ізгоямі.**

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца журналісты друкаваных і электронных беларускіх медыя, журналісты-фрылансеры, блогеры, фатографы, стваральнікі відэа.

Работы будуць разглядацца ў трох намінацыях: «Найлепшая журналіцкая гісторыя», «Найлепшая фотагісторыя», «Найлепшая відэагісторыя». Матэрыялы могуць быць на рускай або беларускай мове і павінны быць апублікаванымі ў друку ці выйсці ў эфір тэлевізійных або радыёвяшчальных СМІ, размешчаны на інтэрнэт-сайтах на працягу 2018 года.

Тэрміны правядзення конкурсу: 20.03.2018—15.11.2018 года. Матэрыялы павінны быць накіраваны ў Міністэрства інфармацыі не пазней за 15 лістапада гэтага года. Пераможцы будуць вызначаны журы да 1 снежня 2018 года. Арганізатары конкурсу абяцаюць добрыя прызы — прафесійную тэхніку і дыпломы ад Міністэрства інфармацыі і ААН.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Тэрыторыя роўнасці

# ДЗЕЦІ І АРТЫСТЫ — СУПРАЦЬ СТЭРЭАТЫПАЎ

**21 сакавіка — Сусветны дзень чалавека з сіндромам Даўна. А 25 сакавіка ў Мінску адбудзецца інклюзіўнае сямейнае свята «Вясновы калейдаскоп» з творчымі выступленнямі дзяцей як з сіндромам Даўна, так і без гэтага дыягназу, а таксама прафесійных артыстаў.**

Ён пройдзе пад дэвізам «Тэрыторыя мастацтва — тэрыторыя роўнасці». У праграме — творчыя выступленні дзіцячых калектываў, забаўляльнае шоу, дэманстрацыя дзіцячых калекцый адзення, шоу-балет Illizium, шоу барабаншчыкаў STRESS. Таксама на свяце выступяць Уладзімір Пугач, Аляксандр Патліс, гурт «Тяни-Толкай». Арганізатарамі свята з'яўляюцца ўстанова па аказанні дапамогі ў складанай жыццёвай сітуацыі «Лёс і надзея», бацькоўскае аб'яднанне "Даўн Сіндром. Інклюзія", Цэнтр моды і стылю M.Y.STUDIO ў партнёрстве з гатэлем «Рэнесанс-Мінск» і Галерэяй TUT.BY.

Медыкі кажуць, што сіндром Даўна ўзнікае ў выніку генетычнай анамаліі. Па статыстыцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, з такім сіндромам нараджаецца кожнае 700—800-е немаўля ў свеце. Гэтыя суадносіны аднолькавыя ў розных краінах, кліматычных зонах і сацыяльных пластах. Генетычны збой адбываецца незалежна ад ладу жыцця бацькоў, іх здароўя, звычак і адукацыі. Існуе шмат забабонаў, звязаных з сіндромам Даўна. З-за адсутнасці дакладнай інфармацыі тысячы сем'яў вымушаныя змагацца за годную будучыню сваіх дзяцей, адчуваючы пры гэтым нярэдка неразуменне і непрыязнасць з боку навакольных. Арганізатары "Вясновага калейдаскопа" лічаць, што сумесныя творчыя мерапрыемствы дапамагаюць пераадолець пэўныя стэрэатыпы ў дачыненні да магчымасцяў людзей з асаблівасцямі ў развіцці.

*Дата: 25 сакавіка 2018 года.*
*Час: з 14.00 да 17.00.*
*Месца: гатэль «Рэнесанс-Мінск», Мінск, Дзяржынскага, 1Е.*
*Уваход вольны.*

**Святлана БУСЬКО** ■

# НАШЫ ЛЮДЗІ НА «БАЗАРЫ»

## Вызначаны ўдзельнік ад Беларусі на фестываль у Віцебску

**Педагог кафедры мастацтва эстрады Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, спявак і акцёр мюзіклаў Яўген Курчыч, які раней выступаў пад псеўданімам Слуцкі па назве роднага горада, стаў пераможцам адбору на конкурс «Славянскага базару ў Віцебску».**



Фота БЕЛТА.

На фінальным адборачным канцэрце, які адбыўся днямі ў сталічным Тэатры эстрады, выканаўца набраў 179 балаў са 180 магчымых. Тэлеверсію канцэрта пакажа ў гэту суботу тэлеканал «Беларусь 3», так што кожны ахвотны зможа самастойна ацаніць вакальныя і артыстычныя здольнасці ўсіх 10 фіналістаў адбору. Пакуль жа дадамо некалькі рысак да партрэту яго пераможцы.

Яўгену Курчычу 27 гадоў, 17 з якіх ён займаецца музыкай, а восем — спрабуе прабіцца на міжнародны вакальны конкурс у Віцебску. Акрамя таго, за мінулы час выканаўца атрымаў ступень магістра мастацтвазнаўства, перамог у тэлепраекце «Акадэмія талентаў» (2012 год), стаў лаўрэатам шэрагу рэспубліканскіх і міжнародных творчых конкурсаў, а сёлета ў складзе гурта Adagio дайшоў да фіналу нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне».

А ў дзіцячым конкурсе «Славянскага базару» нашу краіну прадставіць Арцём Скароль, 12-гадовы жыхар Ашмян. На канчатковым адборы ў сталіцы сярод дзесяці фіналістаў хлопчык набраў найвышэйшую колькасць балаў — 118.

Па ўмовах адбору трэба было выканаць дзве песні: на беларускай мове і сусветны хіт. Арцём праспяваў вядомы твор ансамбля «Песняры» «Конь незацугляны», за што адразу трапіў на другое месца сярод фіналістаў. А канчаткова пераможцы канкурэнтаў дапамагла песня гурта «АББА» «Белы пялёстак», за якую ўсе шэсць суддзяў выставілі юнаму таленту па дзесяць балаў.

Гэтая перамога — не першая ў жыцці школьніка. Арцём быў уладальнікам Гран-пры інтэрнацыянальнага конкурсу дзіцячай творчасці ў Грузіі, займаў першыя месцы ў міжнародным фестывалі «Кубак сяброўства» ў Магілёве, удзельнічаў у дзіцячых творчых конкурсах Расіі і Літвы. Летась ён таксама быў сярод фіналістаў нацыянальнага адбору на конкурс «Віцебск» і нават удзельнічаў у адборачным туры на дзіцячае «Еўрабачанне».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Ірына СІДАРОК.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## КЛІЧАЎ ВОРАГУ НЕ СКАРЫЎСЯ

**У 1942-м тут, на акупаванай ворагам тэрыторыі, на чатыры месяцы была цалкам адноўлена савецкая ўлада.**

Гэта адбылося 20 сакавіка 1942 года. Да канчатковага вызвалення раёна ад нямецкіх захопнікаў заставалася яшчэ больш за два гады, але гэтая дата стала яскравым сімвалам мужнасці і перамогі народа. Да сярэдзіны сакавіка 1942-га партызаны ачысцілі ад валасных упраў і паліцэйскіх гарнізонаў тэрыторыі Клічаўскага, значнай часткі Бярэзінскага, Бялыніцкага і чатырох сельсаветаў Асіповіцкага раёнаў. А 20 сакавіка народныя мсціўцы разграмілі нямецка-паліцэйскі гарнізон у самым Клічаве. У баі было забіта і трапіла ў палон больш за 150 немцаў і паліцэйскіх, захоплена вялікая колькасць зброі і боепрыпасаў. І хоць горад потым перажыў яшчэ не адну блакаду і неаднаразова пераходзіў з рук немцаў у рукі партызан, чатыры месяцы — з 20 сакавіка па 25 ліпеня 1942 года — тут, у нямецкім тыле, панавала савецкая ўлада. Потым мясцовыя органы кіравання перайшлі на падпольны рэжым і не давалі пакою ворагу да вызвалення раёна ў чэрвені 1944 года. Учора Клічаў урачыста адзначыў 76-ю гадавіну са дня тых сакавіцкіх падзей.

— Мы свята шануем гэты дзень, увесь час нагадваем пра яго нашай моладзі. Ён увайшоў у сэрцы як сімвал гераізму і мужнасці нашых землякоў, якія адстаялі мір на зямлі. Менавіта гэтай даце мы абавязаны магчымасцю мірна працаваць, выхоўваць падрастаючае пакаленне, — адзначыў у сваёй прамове падчас мітынгу **старшыня Клічаўскага раённага выканаўчага камітэта Францішак ВАШЧЫЛА.**

Удзел у мітынгу прынялі працоўныя калектывы горада, ветэраны, моладзь, жыхары раёна. Да помніка ў гонар гэтай перамогі былі ўскладзены кветкі. Памяць загінулых ушанавалі хвілінай маўчання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ЯНЫ РАСТОПЯЦЬ МІНСКІ ЛЁД

**Сёння ў сталіцы стартуе IV чэмпіянат свету сярод студэнтаў па канькабежным спорце. Турнір прымае канькабежны стадыён «Мінск-Арэны», у спаборніцтвах возьмуць удзел 114 спартсменаў з 14 краін: Расіі, Польшчы, Нідэрландаў, Казахстана, Італіі, Японіі, ЗША, Кітая, Індыі, Чэхіі, Швецыі, Венгрыі, Фінляндыі і Беларусі.**

Наша зборная будзе прадстаўлена 18 спартсменамі: 12 мужчын і шэсць жанчын. Чакаецца, што лідарам каманды стане студэнт БДУФК Ігнат Галавацюк, у якога сур'ёзны вопыт выступленняў на міжнароднай арэне, нагадаем, у лютым ён прымаў удзел у ХХІІІ зімовых Алімпійскіх гульнях у Пхёнчхане. *«У беларускай камандзе разлічваюць на ўдалае выступленне Ігната Галавацюка, які пазмагаецца на дыстанцыях 500 м, 1000 м, камандным спрынце і масстарце. Спадзяёмся на яго добрую форму»,* — расказаў **Аляксандр НАВАКОВІЧ, намеснік старшыні Беларускага саюза канькабежцаў.** Таксама ён адзначыў, што сур'ёзную канкурэнцыю беларусам складуць атлеты з Расіі, Нідэрландаў, Польшчы і Японіі, дзе традыцыйна студэнцкі спорт развіты на досыць высокім узроўні.

Сёння на стадыёне «Мінск-Арэны» адбудуцца афіцыйныя трэніроўкі, заўтра пройдзе цырымонія адкрыцця чэмпіянату, а таксама будуць разыграны медалі на дыстанцыі 3000 м у жанчын і 5000 м у мужчын у камандным спрынце. Чэмпіянат завершыцца ў Мінску 25 сакавіка.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## А НА ТАКАВІШЧАХ, А НА ТАКАВІШЧАХ...

**З 20 сакавіка па 10 мая ў перыяд з 3 да 9 гадзін дазваляецца ружэйнае паляванне на самцоў глушца і цецерука (з'яўляюцца нармаванымі відамі) на такавішчах спосабамі — з засады, з падыходу.**

У якасці прылад палявання дапускаецца выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 400 джоўляў, гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем патронаў са шротам, паляўнічыя лукі і арбалеты. Ружэйнае паляванне на самцоў слонкі «на цязе» дазваляецца з 7 красавіка па 13 мая з 18 да 22 гадзін наступным спосабам — з засады. Прылады палявання адпавядаюць прыладам, дазволеным для палявання на гусей і качароў качак.

У Дзяржінспекцыі нагадалі, што ў выпадку ўзнікнення неабходнасці перамяшчэння паляўнічага ў працэсе палявання на самцоў слонкі «на цязе» з мэтай выбару аптымальнага месца засады (месца з найбольш інтэнсіўнай цягай), паляўнічую зброю трэба разрадзіць і зачахліць. Яна павінна быць разраджана і зачахлена таксама і ў той час сутак, калі паляванне на слонку, глушца і цецерука забаронена.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЦАРКОЎНЫ ЗЛОДЗЕЙ

**Афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў Сяргей ДУЧЭНКА паведаміў, што затрыманы грамадзянін па падазрэнні ў крадзяжах маёмасці з праваслаўных храмаў вобласці.**

Пры сабе ў 26-гадовага жыхара адной з вёсак Кобрынскага раёна былі прыстасаванні для ўзлому замкоў. Ён трапіў у поле зроку супрацоўнікаў крымінальнага вышуку ў выніку праведзеных аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў. З восені мінулага года цэрквы палескай зоны перыядычна наведваў злодзей. Ён прабіраўся ў храм ноччу, ускрываў замок на дзвярах і забіраў грошы са скрыні для ахвяраванняў. Такім чынам пацярпелі цэрквы ў Бярозаўскім, Брэсцкім, Драгічынскім, Пінскім, Кобрынскім раёнах.

Аператыўнікі звярнулі ўвагу на почырк зламысніка, які ва ўсіх эпізодах быў адзін і той жа. Знайшлі шэраг улік і паступова выйшлі на след непрацуючага, раней судзімага за крадзеж вяскоўца. Затрымалі яго ў Кобрыне на чыгуначным вакзале.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Будзь у курсе!

# Кошт праезду ў цягніках павялічыўся

**З 20 сакавіка ў Беларусі падаражэў праезд у цягніках гарадскіх ліній і рэгіянальных ліній эканом-класа. З 1 красавіка падаражэе праезд у цягніках рэгіянальных ліній бізнес-класа і міжрэгіянальных ліній, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Павышэнне кошту праезду ў цягніках гарадскіх, рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній прадугледжана пастановай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, афіцыйна апублікаванай на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь.

Кошт праезду цягнікамі гарадскіх ліній узрос у сярэднім на 2—6 % у залежнасці ад тарыфнага пояса, у якім праязджае пасажыр. Напрыклад, кошт праезду цягнікамі гарадскіх ліній у межах аднаго тарыфнага пояса (Мінск—Беларусь, Мінск—Гарадзішча, Мінск—Міханавічы) павялічыўся на 2 капейкі і складае 0,90 рубля. У межах двух тарыфных паясоў (Мінск—Рудзенск, Мінск—Смалявічы) кошт праезду павялічыўся на 6 капеек і складае 1,10 рубля.

Кошт праезду цягнікамі рэгіянальных ліній эканом-класа ўзрос на 24 % і складае: 0,20 рубля за першую зону (замест 0,16 рубля); 0,02 рубля за кожны дадатковы кіламетр (замест 0,016 рубля).

Акрамя таго, з 1 красавіка павышаюцца тарыфы на перавозкі: цягнікамі міжрэгіянальных ліній эканом-класа на 24 %; цягнікамі рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній бізнес-класа на 32 %.

Апошні раз тарыфы на праезд чыгуначным транспартам унутры Беларусі павышаліся 26 снежня 2015 года.

Больш падрабязную інфармацыю аб кошце праезду ў цягніках гарадскіх, рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній можна атрымаць на сайце www.rw.by, а таксама ў чыгуначных касах і па тэлефонах даведачных службаў.



Фота БЕЛТА.

# Расклад руху скарэктаваў «летні» час

**У сувязі з пераходам на «летні» час краін Еўрапейскага саюза і Украіны ў ноч з 24 на 25 сакавіка Беларускай чыгункай сумесна з чыгуначнымі адміністрацыямі Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны загадзя праведзена карэкціроўка раскладу руху міжнародных цягнікоў.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, напрыклад, цягнік № 805 Мінск—Вільнюс, які адпраўляўся з Мінска ў 7.35 і прыбываў на канцавы пункт руху ў 9.05, з 25 сакавіка будзе прыбываць у Вільнюс у 10.05 (час адпраўлення з Мінска застанецца без змен). Цягнік № 806 Вільнюс—Мінск адпраўляўся з Вільнюса ў 18.30 і прыбываў у сталіцу Беларусі ў 22.00, а пасля 25 сакавіка будзе адпраўляцца з Вільнюса ў 19.30. Час прыбыцця ў Мінск застанецца ранейшы.

У сувязі са зменамі ў графіку руху міжнародных цягнікоў скарэктаваны і расклад асобных цягнікоў, якія курсіруюць па тэрыторыі Беларусі.

Так, у штодзённых перасадачных зносінах Мінск—Брэст—Варшава цягнік № 727 Мінск—Брэст, які адпраўляўся са сталіцы ў 10.57 і прыбываў у Брэст у 14.31, з 25 сакавіка будзе адпраўляцца з Мінска ў 9.55 і прыбываць у Брэст у 13.31. Адпаведна, цягнік № 127 Брэст—Варшава, які адпраўляўся з Брэста ў 15.23 і прыбываў у Варшаву ў 17.59, пасля пераходу на «летні» час будзе адпраўляцца ў 14.23. Час прыбыцця ў Варшаву застанецца ранейшы. У адваротным кірунку пасля 25 сакавіка час адпраўлення цягніка № 128 Варшава—Брэст застанецца ранейшы (8.16), у Брэст цягнік прыбудзе ў 13.49 (цяпер прыбывае ў 14.49). Цягнік № 728 Брэст—Мінск будзе адпраўляцца з Брэста ў 14.20 (да 25 сакавіка адпраўляўся ў 15.15) і прыбываць у сталіцу Беларусі ў 18.06.

Больш падрабязную інфармацыю аб раскладзе руху цягнікоў можна атрымаць на сайце www.rw.by, а таксама ў чыгуначных касах і па тэлефонах даведачных службаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


## СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ВРЕМЯ ОТДЫХАТЬ С БЕЛКАРТ!»

БЕЛКАРТ Тебе ближе

Организатор рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак». УНП 192325716, 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, 3-й этаж.

Наименование рекламной игры: «Время отдыхать с БЕЛКАРТ!».

Территория проведения: Республика Беларусь.

Срок начала и окончания рекламной игры: игра проводится с 1 октября 2017 года по 27 марта 2018 года.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь (свидетельство о государственной регистрации № 3097 от 13 сентября 2017 года).

Сведения о количестве участников рекламной игры: в игре приняли участие 347 520 (триста сорок семь тысяч пятьсот двадцать) человек.

Сведения о розыгрыше призового фонда: призовой фонд (122 приза), общий размер которого составляет 15 149 (пятнадцать тысяч сто сорок девять) белорусских рублей 16 копеек разыгран полностью.

**Список победителей 1-го розыгрыша:**

Приз первого порядка – плед Nashville 120*180 см, флис./полиэстер., т.-синий + нанесение логотипа

1. Савко Иван Григорьевич, г. Гродно
2. Дрозд Тамара Григорьевна, г. Минск
3. Осмоловская Эльвира Александровна, г. Витебск
4. Денисенко Светлана Сергеевна, г. Фаниполь
5. Невдах Янина Степановна, г. Гродно
6. Котенко Олег Валентинович, г. п. Чисть
7. Кольцова Светлана Антоновна, г. Минск
8. Лутова Лариса Ивановна, г. Минск
9. Демченко Людмила Николаевна, г. Орша
10. Лучина Мария Ивановна, г. Борисов
11. Даревская Татьяна Ивановна, г. Барановичи
12. Ваньян Олег Рафикович, г. Минск
13. Сайко Валерий Иосифович, г. Ошмяны
14. Лопатин Николай Васильевич, г. Бобруйск
15. Лабода Алла Федоровна, г. Минск
16. Шарко Зинаида Ефимовна, г. Борисов
17. Костюченок Владимир Александрович, г. Новополоцк
18. Санько Галина Андреевна, г. Минск
19. Студенчик Татьяна Яковлевна, г. Слоним
20. Стешенко Зоя Алексеевна, г. Гомель

Приз первого порядка – зонт-трость п/автомат 105 см, ручка дерев. Nancy т.-синий + нанесение логотипа

1. Горбунова Тамара Ивановна, г. Минск
2. Качан Нина Владимировна, г. Мосты
3. Чистовский Сергей Алексеевич, г. Витебск
4. Рулинская Любовь Александровна, г. Копыль
5. Яковлева Елена Акимовна, г. Брест
6. Носовицкий Валерий Яковлевич, г. Жлобин
7. Павловская Ольга Анатольевна, г. Вилейка
8. Засухина Светлана Сергеевна, г. Витебск
9. Казущик Ядвига Ивановна, а/г. Тальминовичи
10. Куликовская Валентина Ивановна, г. Слуцк
11. Казин Евгений Исаакович, г. Гродно
12. Ступкина Лариса Ивановна, г. Солигорск
13. Бычковская Татьяна Ивановна, г. Жлобин
14. Генрих Мария Чеславовна, г. Марьина Горка
15. Германов Анатолий Филиппович, г. Витебск
16. Бойкова Людмила Леонидовна, г. Гомель
17. Сидорченко Вера Николаевна, г. Минск
18. Ковалева Фаина Валентиновна, г. Костюковичи
19. Дивулинская Татьяна Борисовна, г. Чашники
20. Иванов Владимир Валентинович, г. Гродно

Приз второго порядка – подарочный сертификат «Электросила» номиналом 190 рублей + денежная сумма в размере 11,80 бел. руб.

1. Иоцюс Валентина Васильевна, г. Могилев
2. Мороз Зоя Павловна, г. Минск
3. Попиль Борис Григорьевич, д. Боровляны
4. Нестер Людмила Николаевна, г. Сморгонь
5. Сержант Тамара Александровна, г. Минск
6. Жук Ядвига Викторовна, г. Каменец
7. Кузьмина Татьяна Михайловна, г. Минск
8. Семенков Леонид Моисеевич, г. Минск
9. Жвирбля Татьяна Ивановна, г. Мосты
10. Сосновская Людмила Григорьевна, г. Несвиж
11. Свириденко Татьяна Ольгертовна, г. Минск
12. Карпенко Наталья Егоровна, г. Сморгонь
13. Досаева Тамара Егоровна, г. Минск
14. Лук Евгения Ивановна, г. Брест
15. Корнеева Наталья Васильевна, г. Горки
16. Концевая Любовь Михайловна, г. Минск
17. Лощ Галина Алексеевна, г. п. Октябрьский
18. Кириенко Василий Андреевич, г. Слуцк
19. Радомский Владимир Алексеевич, г. Столбцы
20. Протасеня Николай Викторович, г. Солигорск

Главный приз – подарочный сертификат РУП «ЦЕНТРКУРОРТ» на сумму 2500 белорусских рублей, в счет оплаты туристических услуг, оказываемых на территории Республики Беларусь + денежная сумма в размере 356,98 бел. руб.

1. Паус Александр Семенович, г. Борисов

**Список победителей 2-го розыгрыша:**

Приз первого порядка – плед Nashville 120*180 см, флис./полиэстер., т.-синий + нанесение логотипа

1. Попова Лидия Васильевна, г. Молодечно
2. Сапункова Лидия Константиновна, г. Гродно
3. Матейкович Ольга Сергеевна, г. Жодино
4. Логвинович Нелла Константиновна, г. Узда
5. Юшковская Жанна Феликсовна, г. Витебск
6. Жмейдо Виктор Семенович, г. Костюковичи
7. Павленко Александр Михайлович, г. Гродно
8. Лобан Елена Ивановна, г. Жодино
9. Малойло Антонина Болеславовна, г. Несвиж
10. Шумский Аркадий Александрович, г. Минск
11. Воронова Раиса Николаевна, г. Светлогорск
12. Долотов Павел Григорьевич, а/г Вертелишки
13. Ветченко Любовь Алексеевна, д. Новики
14. Петкевич Людмила Алексеевна, п. Скориничи
15. Лукьяненко Нина Александровна, г. Сморгонь
16. Кошелева Мария Михайловна, д. Солтаново
17. Кулешова Вера Адамовна, г. Могилев
18. Шевелева Валентина Ивановна, г. Мозырь
19. Кравченко Ирина Михайловна, г. Речица
20. Макаревич Светлана Ивановна, г. Минск

Приз первого порядка – зонт-трость п/автомат 105 см, ручка дерев. Nancy т.-синий + нанесение логотипа

1. Иванова Надежда Валентиновна, г. Гродно
2. Носкова Галина Афанасьевна, г. Гомель
3. Капаченя Ольга Александровна, г. Минск
4. Горбунова Вера Ивановна, г. Минск
5. Танкович Светлана Владимировна, г. Минск
6. Велько Мария Анатольевна, г. Минск
7. Сенюкович Ольга Дмитриевна, г. Лунинец
8. Шулико Ольга Викторовна, г. Гомель
9. Навозенко София Петровна, а/г Первомайская
10. Филанович Леонид Антонович, а/г. Дубровка
11. Жигунов Николай Антонович, г. Петриков
12. Наумик Людмила Александровна, г. Барановичи
13. Таберко-Поддуева Лидия Доминиковна, а/г Лошница
14. Лойко Тамара Александровна, г. п. Победа
15. Слесарь Тамара Алексеевна, г. Волковыск
16. Урбанович Ядвига Михайловна, а/г Орля
17. Третьяков Сергей Николаевич, г. Минск
18. Зайцева Лидия Ивановна, г. Гомель
19. Шабалина Наталья Юрьевна, г. Минск
20. Жилевич Николай Николаевич, г. Пинск

Приз второго порядка – подарочный сертификат «Электросила» номиналом 190 рублей + денежная сумма в размере 11,80 бел. руб.

1. Лунькина Ольга Николаевна, г. Минск
2. Салейчук Геннадий Трофимович, г. Минск
3. Вакульчик Евгений Лукьянович, а/г Черни
4. Кузнецова Регина Либертовна, г. Слоним
5. Кривенок Семен Иванович, г. п. Ветрино
6. Абрамчик Нина Григорьевна, г. Новогрудок
7. Семерник Владимир Петрович, г. Молодечно
8. Рысенкова Людмила Владимировна, г. Могилев
9. Петрова Валентина Александровна, г. Барановичи
10. Козлова Людмила Афанасьевна, г. Гомель
11. Крупенько Владимир Владимирович, п.Сеньково
12. Драбатович Иван Николаевич, г. Клецк
13. Шипуля Светлана Викторовна, г. Гродно
14. Маломальская Анна Фоминична, г. Жодино
15. Малыгина Валентина Васильевна, г. Борисов
16. Васильева Зинаида Владимировна, г. Жодино
17. Грещик Мира Ивановна, г. п. Зельва
18. Шалупенко Светлана Петровна, г. Орша
19. Афанасьева Зоя Аркадьевна, г. Минск
20. Перцева Мария Адольфовна, г. Гродно

Главный приз – подарочный сертификат РУП «ЦЕНТРКУРОРТ» на сумму 2500 белорусских рублей, в счет оплаты туристических услуг, оказываемых на территории Республики Беларусь + денежная сумма в размере 356,98 бел. руб

1. Коновалова Лилия Леонидовна, г. Слуцк

Поздравляем победителей!

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: 8 (033) 335-51-10


**Считать недействительными** выданные СООО «Белкоопстрах» квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии СВ номера 0602611-0602620 в связи с утерей.


### Извещение о проведении 2 апреля 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белметалл»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) |
|---|
| «склад» общей площадью 691,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 400/С-25201, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ |
| площадь земельного участка – 0,4682 га, кадастровый номер 440100000001010184 |
| Местонахождение – г. Гродно, пер. Победы, 5/4 |
| Начальная цена – 57 500,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка – 5 700,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», пр. Партизанский, 174, к. 301, 220075, г. Минск, телефон (017) 344-87-71.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 2 апреля 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 21.03.2018 по 29.03.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 344-87-72, (029) 138-59-31 (ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ»).

■ На скрыжаванні думак

# ШКОЛА — НЕ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ?

**Як пабудаваць эфектыўную сістэму адукацыі? У чым асноўная праблема сучаснай школы? Ці можна вучыцца для задавальнення, а не для атрымання адзнакі? Наколькі апраўдана вывучаць асобныя прадметы, калі ў жыцці патрабуюцца агульныя міжпрадметныя ўменні і навыкі? Ці мае настаўнік права на памылку? У чым увогуле заключаецца місія сучаснага педагога? Гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі першага міжнароднага адукацыйнага форуму «ПраШколу: ТакМожна!». Яго спікерамі сталі эксперты і практыкі ў сферы школьнай адукацыі з пяці краін: Беларусі, Эстоніі, Расіі, Швецыі і Украіны. Цікавасць да мерапрыемства з боку педагогаў і бацькоўскай грамадскасці аказалася настолькі высокай, што зала не змагла змясціць усіх ахвотных, таму арганізатары прадугледзелі анлайн-трансляцыю на партале Ребенок.BY**

## Чаму настаўнікі любяць Льва Талстога больш, чым сваіх вучняў



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## Аўтаномія настаўнікаў

— Мы не можам здзяйсняць у школе цуды, але рабіць яе лепшай штодня — у нашых сілах, — упэўнена **Лайнэ Белавас, заснавальнік і дырэктар Noarootsi Gümnaasium, адной з самых вядомых устаноў адукацыі ў Эстоніі (узначальвае яе ўжо 30 гадоў), ментар кіраўнікоў у сферы адукацыі.** — Кажуць, што эстонцы не вельмі рэлігійныя людзі, але мы верым у нашу адукацыю!

Трэба заўважыць, што па выніках апошняга даследавання, праведзенага ў рамках Міжнароднай праграмы па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў (PISA), Эстонія ўвайшла ў тройку лідараў у свеце, а ў Еўропе яна займае першую пазіцыю. Пры гэтым у школах ніхто асобна да тэсціравання PISA не рыхтуецца. Ідзе звычайны штодзённы навучальны працэс. «Адукацыя — гэта не толькі тэсты, а PISA — не самае галоўнае», — падкрэслівае дырэктар гімназіі.

Дарэчы, эстонскія вучні паказалі самы высокі вынік у Еўропе па вырашэнні праблем у групах і апынуліся на шостым месцы ў сусветным рэйтынгу PISA па гэтым паказчыку. «Навошта прыходзіць у школу, каб у адзіночку вырашаць задачы, гэта можна зрабіць і дома, — разважае Лайнэ Белавас. — А на ўроках абавязкова павінны прысутнічаць сумесная работа, адпрацоўка ўмення вырашаць нейкую праблему ў камандзе».

Калі ў Эстоніі дваццаць гадоў таму вырашылі зрабіць стаўку на адукацыю, то ў аснову рэфармавання сваёй школы паклалі вопыт фінаў. А сёння «вучні» ўжо нават пераўзышлі сваіх «настаўнікаў» — абышлі Фінляндыю ў міжнародным рэйтынгу паспяховасці 15-гадовых падлеткаў.

— Першае, што мы пазычылі ў фінскіх калег, гэта аўтаномія школ і свабода настаўнікаў, — канстатуе Лайнэ. — Міністэрства адукацыі давярае дырэктару, а дырэктар давярае настаўнікам. Педагогаў не кантралююць, а падтрымліваюць. План урока настаўнік піша для сябе: дырэктар ніколі не правярае яго наяўнасць ці адсутнасць. Галоўнае — каб урок прайшоў паспяхова. За трыццаць гадоў свайго дырэктарства я наведала толькі некалькі ўрокаў сваіх настаўнікаў. Кожны год мы праводзім у школе ананімнае апытанне, каб высветліць у вучняў, іх бацькоў і педагогаў усе «плюсы» і «мінусы»: што ў нашай гімназіі добра, а над чым яшчэ трэба працаваць. А потым разам абмяркоўваем, што можна зрабіць.

Настаўнікі абапіраюцца на дзяржаўную вучэбную праграму, але самі вырашаюць, што, з дапамогай якіх метадаў і па якіх падручніках яны будуць выкладаць, карэктуюць праграму пад патрэбы сваіх вучняў і ўласнае бачанне прадмета, таму крэатыўнасць вельмі высокая. Ад настаўніка не патрабуюць плана ў і справаздач: уся патрэбная інфармацыя змяшчаецца ў электронных дзённіках.

Лайнэ перакананая, што права на памылку ёсць ва ўсіх: у вучняў, настаўнікаў і дырэктара. Без памылак не атрымаецца ўкараняць новыя метады і спосабы работы, немагчыма эксперыментаваць.

Вучань можа спрачацца і не пагаджацца з настаўнікам, можа выказаць пажаданні па змесце прадмета, які вывучае, — і ён будзе пачуты. Вельмі важны момант — магчымасць выбару. Колькасць абавязковых курсаў для гімназістаў за апошнія гады зменшылася з 96 да 64. З асноўных прадметаў — мовы, матэматыка, фізіка, хімія, геаграфія, біялогія... Астатнія вучні і школы выбіраюць самі. Напрыклад, можна вывучаць рэлігію свету, псіхалогію, эканоміку, французскую, рускую мовы і іншыя дысцыпліны.

У апошні тыдзень навучальнага года гімназісты маюць магчымасць адправіцца ў іншую гімназію ў іншы рэгіён, каб праслухаць курс, які прапануецца там: выбар надзвычай шырокі — 80 курсаў. Адбываецца абмен гімназістамі. Трэба заўважыць, што гімназія — гэта старшая ступень агульнай сярэдняй адукацыі ў Эстоніі (10—12 класы).

## Камфортнае асяроддзе для ўсіх

Канікулы цягам года размяркоўваюцца так, каб дзеці не паспявалі стаміцца: тыдзень — у кастрычніку, два тыдні — на Каляды, затым тыдзень у лютым і ў красавіку. Старэйшыя школьнікі заканчваюць вучобу ў сярэдзіне чэрвеня, малодшыя — у канцы мая і да 1 верасня ўсе адпачываюць.

У Noarootsi Gümnaasium дзейнічае некалькі простых, але важных правілаў: у школе павінна быць добра ўсім — і тым, хто вучыцца, і тым, хто там працуе. Вучань і настаўнік з'яўляюцца партнёрамі. «Нашы выхаванцы настолькі прызвычаіліся да бясплатнага Wi-Fi у гімназіях і школах, што ўспрымаюць яго ўжо як сваё грамадзянскае правы», — жартуе дырэктар.

Сярод забарон, якія распаўсюджваюцца на вучняў, — пропуск урокаў, ужыванне алкаголю і наркотыкаў. Нельга таксама знаходзіцца на вуліцы пасля 23 гадзін, хадзіць па школе ў вулічным абутку і быць няветлівым.

«А ці дзейнічаюць нейкія патрабаванні да вонкавага выгляду вучня і ці існуе дрэс-код для настаўнікаў?» — пацікавіліся беларускія педагогі. «Прыйсці ў брудным адзенні ў школу будзе няветліва, а ва ўсіх астатніх выпадках — якая розніца, якога колеру «дрэскод»? Усе кіруюцца правіламі агульнай культуры», — адказала дырэктар.

І ўсё ж такі няўжо ў эстонскай школе зусім няма праблем?

— У адрозненне ад Фінляндыі, дзе статус настаўніка вельмі высокі, заробкі педагогаў перавышаюць сярэдні па краіне, і ў прафесію ідуць найлепшыя выпускнікі, у нас сітуацыя іншая, — прызналася Лайнэ Белавас. — Сярэдні ўзрост настаўнікаў у Эстоніі — 48 гадоў. І якім будзе вынік эстонскіх школьнікаў на PISA яшчэ праз дзесяць гадоў, я, шчыра кажучы, не ведаю. Але ўпэўнена, што галоўны складнік паспяховай школы — гэта настаўнік, які не толькі добра ведае сваю дысцыпліну, але і можа перадаць каштоўныя веды дзецям. Мы зараз думаем над тым, як максімальна звязаць школьныя прадметы з рэальным жыццём і матываваць дзяцей на вучобу.

## Захраслі ў мінулым

— Матывацыя — складаная штука. Як працаваць, калі ў цябе не атрымліваецца? Што рабіць, калі не хочацца садзіцца за ўрокі? Хто цябе дапамагчы? Гэта больш важныя пытанні, чым колькі будзе 2 + 2, — упэўнена **вядомы расійскі псіхолаг і публіцыст, аўтар шматлікіх кніг, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў галіне адукацыі Людміла ПЕТРАНОЎСКАЯ**. — Дзеці павінны хацець вучыцца, але ўсе ўпэўнены, што гэта нешта нерэальнае. Чамусьці лічыцца, што матывацыя можа фарміравацца толькі праз пачуццё абавязку. Проста нейкая агульная змова хлусні. Настаўніца піша бацькам: «Дзіця не працуе на ўроку, прыміце меры!» Тыя прачыталі, але што яны павінны зрабіць? Ёсць ідэі? Асабліва мне падабаецца варыянт «пагутарыце з ім». Што б рабіла мама, калі б ёй не сказалі пра гэта? Падобная думка, напэўна, ніколі яе не наведвала, цяпер, на шчасце, ёй падказалі «выйсце», і зараз усё будзе добра. Гэта хлусня, калі ўсе робяць выгляд, што вырашаюць праблему. Маму выклікаюць у школу, просяць пагутарыць, яна кажа, што дзіця ківае, але нічога не змяняецца.

Праблема яшчэ і ў тым, што для таго, каб навучыць дзіця быць гаспадаром самому сабе, ставіць мэты, улічваць свае памылкі, працаваць над матывацыяй, настаўнік павінен умець рабіць гэта сам. А вось з гэтым бяда... Шведскія калегі расказваюць, што ў іх стаіць задача — сумясціць веды і дэмакратыю, а расійская школа спрабуе вырашыць іншую задачу — як зрабіць выгляд, што мы даём веды, прычым каб у дзяцей нават не зарадзілася думкі аб дэмакратыі. Складана, таму што дзеці толькі пра гэта і думаюць, яны хочуць свабоды, зменняў, справядлівасці, у іх узнікаюць шматлікія пытанні.

Людміла Петраноўская заўважае, што мы жывём ужо не ў час навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, а ў час навукова-тэхнічнага выбуху. І наша школа — гэта вялікі анахранізм у сучасным свеце. Нейкі выпадкова ацалелы мастадонт, які ходзіць па вуліцах і ўхіляецца ад Tesla. Школа — тая, што ёсць цяпер, была створана для эпохі індустрыялізацыі, дзе поспех залежаў ад таго, наколькі зладжана будзе працаваць велізарная сістэма з вялікай колькасцю як металічных, так і чалавечых вінцікаў, наколькі дакладна яны будуць выконваць прадпісаныя ім алгарытмы.

І тады школа бліскуча спраўлялася з гэтай задачай, яна добра рыхтавала навукова-тэхнічныя кадры для індустрыялізацыі, рабочых — для канвеера. Але свет змяніўся. І як ні дзіўна, у менш выгаднай сітуацыі аказаліся тыя краіны і сістэмы адукацыі, у якіх былі заслугі. Рэфармаваць сістэму адукацыі маленькай і кампактнай Эстоніі — складаная, але вырашальная задача. А вось зрабіць гэта ў Расіі ці Германіі няпроста. Заслужаныя педагогі кажуць: «Мы ўсё жыццё рабілі так, і ўсё ў нас атрымлівалася. Дык навошта цяпер па-іншаму?» І бацькі іх падтрымліваюць: «Зрабіце, як было раней. З нас людзей выхавалі, зрабіце тое ж і з нашымі дзецьмі!»

## «Сасуды» для ведаў

— Задача стаіць глабальная. Хопіць выкарыстоўваць дзяцей для таго, каб укладваць у іх веды, трэба, нарэшце, пачаць іх вучыць, — канстатуе Людміла Петраноўская. — Як пабудавана індустрыяльная школа? Мы бяром масіў ведаў (Леў Талстой, інтэгралы, малекулы бензолу) і пераносім яго, перасаджваем у галовы наступнага пакалення. І якая роля ва ўсім гэтым адводзіцца дзіцяці? Яно ўсяго толькі сродак, «пасудзіна» для таго, каб наш Леў Талстой не выветрыўся. Ёсць такія настаўнікі, якія вельмі любяць літаратуру і Льва Талстога, яны ўсё пра яго ведаюць і разумеюць. Праблема ў тым, што яны любяць Льва Талстога больш, чым дзяцей. І крыўдзяцца на вучняў за тое, што тыя не любяць яго гэтаксама, як яны.

Дзеці адчуваюць, што не яны галоўныя, што школа не для іх, яны толькі сродак. А дзіця хоча, каб з ім размаўлялі, каб настаўнік хадзіў у школу для яго, каб пагаварыць з ім пра яго, каб дзіця магло рэалізаваць свой патэнцыял. Яму нецікава быць сродкам для добрых паказчыкаў школы пры здачы экзаменаў.

— Канцэпцыя індустрыяльнай школы — вучыць усіх і ўсяму аднолькава — не ў інтарэсах дзіцяці. Мы набіваем галовы вучняў нейкім хаосам і не даём прайсці свой шлях, адчуць, на што адгукаецца іх сэрца, у чым заключаецца іх місія. Таму што ўсё патанае ў велізарнай колькасці неасэнсаванага і незразумелага. Калі казаць пра змест, пра social skills (развіццё сацыяльных навыкаў), то з гэтым таксама бяда, — падкрэслівае псіхолаг. — У нас уся адукацыя пабудавана вертыкальна, ніякая дзейнасць у камандзе не прадугледжаная. Калі дзеці пачынаюць перашэптвацца, то адразу ж гучыць: «Не глядзі, не гавары, не спісвай». Якая праца ў камандзе? Толькі калі гэта імітацыя на адкрытым уроку перад камісіяй, дзе мы паказваем элементы гульні. У рэальнасці дзецям не дазволена працаваць разам над чымсьці сур'ёзным. Усё ўзаемадзеянне адбываецца толькі вертыкальна — праз настаўніка.

## Жывы арганізм

Школа пастаянна параўноўвае дзяцей з нейкім стандартам. Памятаеце, у парках раней была забава: выразалі з фанеры сілуэт дзяўчыны і прапаноўвалі параўнаць, чыя фігура найлепш супадзе. Так і з дзіцем, якому настаўнік кажа: «Тут ты недацягнуў, тут у цябе не атрымалася...» І ўсе памылкі трактуюцца адназначна як яго віна, а не як магчымасць для развіцця, што істотна стрымлівае рост. Калі чалавек не памыляецца, значыць, ён робіць тое, што ўжо ўмее. Значыць, ён у гэты момант не вучыцца. Стаўленне да памылкі — адна з вялікіх праблем нашай школы. Чамусьці лічыцца, што найлепшы спосаб прымусіць дзіця вучыцца — зрабіць так, каб яно пачало ад страху заікацца. Але ні дзіця, ні нават дарослы чалавек не могуць навучацца ў стане стрэсу. Гэта фізіялогія...

Сёння трэба адыходзіць ад стандартызацыі, ад таго, што ўсе дзеці павінны «роўненька сядзець за партамі». Гэта поўны пераварот у галовах і велізарныя матэрыяльныя рэсурсы, неабходныя для ўвасаблення такой сістэмы ў рэчаіснасць. Але тыя краіны, якія ўкладуць сродкі ў падобнае навучанне, будуць далёка наперадзе. Кожнае дзесяцігоддзе разрыў паміж рэфармаванымі і нерэфармаванымі сістэмамі адукацыі будзе расці. А пакуль замест рэформы мы назіраем рабізну з нейкіх фармальных і хаатычных змяненняў, самым разумным было б, каб чыноўнікі прыбралі рукі ад школ і далі магчымасць ім самім развівацца. Школа — гэта жывы арганізм, які самастойна зможа адаптавацца да патрэб вучняў і часу...

Людміла Петраноўская канстатуе, што работа педагога сёння недастаткова ўсведамляецца як гуманітарная дзейнасць, не бярэцца пад увагу, што дзеці — таксама людзі. Ва ўніверсітэтах студэнты вывучаюць біяграфіі славутых педагогаў, але ім не расказваюць, што рабіць, калі вучань залез пад парту і там кукарэкае.

— Знайсці свайго настаўніка — вялікая ўдача. Калі вам пашанцавала, то трымайцеся за яго мёртвай хваткай, беражыце, абараняйце ад адміністрацыі, бо тады педагог заўсёды знаходзіцца пад пастаянным ціскам, — параіла Людміла Петраноўская бацькам. — Ён пастаянна павінен адчуваць вашу падтрымку.

**Надзея НІКАЛАЕВА**



# ДАЎ ШАКАЛАДКУ? МОЖА, ЁН АДЗІНОКІ І ДОБРЫ ЧАЛАВЕК?..

## А вы верыце ў дружбу паміж 40-гадовым мужчынам і 11-гадовай дзяўчынкай?

**«Маёй дачцэ нядаўна споўнілася 11 гадоў, — расказвае Ірына (імя жанчыны зменена па этычных прычынах). — Яшчэ дзіця, але ўжо і не зусім. Нядаўна з ёй адбыўся выпадак, ад якога мяне дагэтуль трасе... Раніцай, калі яна ішла да метро, яе сустрэў мужчына крыху за 40. Ён стаяў так, што прайсці міма яго было нельга. Сказаў маёй дачцэ: «Я цябе так чакаў!», пачаставаў шакаладкай і правёў яе амаль да самай школы. Па дарозе запрасіў заходзіць да яго ў госці на працу і сказаў, дзе працуе... Я тут жа патэлефанавала ў міліцыю. Ну не веру я ў дружбу і запрашэнне «ў госці», калі гаворка пра 40-гадовага мужчыну і 11-гадовую дзяўчынку!..»**

### Спецыяліст: «Гэта вельмі падазроныя паводзіны для мужчыны»

Ірына кажа, што пра ўсё, што адбылося, дачка расказала ёй толькі пасля таго, як яна выявіла ў кішэні пухавіка дзяўчынкі шакаладку. «Тысячу разоў я казала ёй, што размаўляць і браць нешта ад незнаёмцаў нельга. І ўсё роўна яна ні на секунду не западозрыла нічога дрэннага. На маё пытанне «Як ты магла?» адказ быў: «Мама, я не надала гэтаму значэння, я ні хвіліны не думала, што гэта дрэнны чалавек».

Пазней пасля некалькіх гутарак з дачкой Ірына змагла прааналізаваць і «раскласці па палічках» прычыны, па якіх яе дзяўчынка ледзь не трапіла на вудачку незнаёмага мужчыны. Вось яны: дачцэ ён здаўся звычайным і добрым дзядзечкам. Ён успрымаўся дачкой як ужо знаёмы — толькі таму, што загаварыў з ёю першы раз яшчэ на мінулым тыдні, значыць, не страшны... Ён умее правільна задаваць пытанні і мякка гаварыць — дачка зусім не запомніла яго выгляд, толькі ўзрост і голас. Голас, кажа, быў добры... Дзяўчынцы было няпрыемна не адказваць на пытанні дарослага — гэта ж нязветліва! Ён даў ёй шакаладку? Ну, напэўна, ён адзінокі і добры чалавек...

«Вось так. Нягледзячы на ўсе размовы і сістэматычнае паўтарэнне правілаў бяспекі... Гэта дзеці. Яны ўсё роўна не разумеюць усяго», — робіць высновы Ірына.

Акрамя расказу аб тым, што здарылася, нашаму выданню, Ірына напісала пра гэта ў сваім акаўнце ў «Фэйсбуку» і атрымала мноства каментарыяў. Вельмі шмат іх было ад іншых мам у стылі «вы малайчына, але я не здагадалася б звярнуцца ў міліцыю». Але што, калі Ірына занадта трывожная маці і зрабіла з мухі слана?

Я пераказала гэтую гісторыю **начальніку аддзела псіхолага-фізіялагічных даследаванняў галоўнага ўпраўлення судова-псіхіятрычных экспертыз цэнтральнага апарату ДКСЭ Людміле МУН,** якая праводзіць апытанні дзяцей, што пацярпелі ад сексуальнага гвалту. «Гэта вельмі падазроныя паводзіны для мужчыны, — адказала спецыяліст. — І мама правільна зрабіла, што забіла трывогу. Дзіця ў сілу адсутнасці жыццёвага вопыту не заўсёды можа вызначаць, нармальныя паводзіны ў дарослага чалавека ці яны павінны выклікаць падазрэнні. Не заўсёды яшчэ нашы дзеці разумеюць, што людзі бываюць розныя і не варта, безумоўна, даваць усім дарослым...»

### Дзеці і іх бацькі часта маўчаць да апошняга

У апошні час СМІ ўсё часцей пішуць пра дзяцей, якія сталі ахвярамі педафілаў, павялічылася і раскрывальнасць такіх злачынстваў міліцыяй.

— Толькі за два месяцы 2018 года колькасць пацярпелых ад сексуальнага гвалту дзяцей павялічылася амаль у два разы ў параўнанні з мінулым годам — выяўлена 113 ахвяр, але сапраўдная іх колькасць нашмат большая, — гаворыць **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Генадзь КАЗАКЕВІЧ.** — А ў цэлым за апошнія пяць гадоў колькасць устаноўленых фактаў сексуальнага гвалту над дзецьмі вырасла ў 15 разоў, колькасць ахвяр гэтых злачынстваў — амаль у чатыры разы. Але рост колькасці выяўленых злачынстваў кажа толькі аб тым, што праваахоўнікі больш актыўна сталі імі займацца. А сама праблема існавала заўсёды. Толькі раней абмяркоўваць яе было не прынята. Цяпер сітуацыя змянілася... На жаль, злачынцы і іх ахвяры доўгі час застаюцца па-за полем зроку праваахоўнікаў. Сярод асноўных прычын — замоўчванне такіх фактаў бацькамі або самімі дзецьмі. Не выкаранена таксама практыка «не выносіць смецце з хаты» і ва ўстановах адукацыі і аховы здароўя.

### «Мы знаходзілі інструкцыі, як схіліць дзіця да сексуальнага кантакту»

Разам з тым спецыялісты адзначаюць, што расследаванне сексуальных злачынстваў супраць дзяцей — вельмі складаная задача. «Так, адна з праблем — цяжкасці са зборам доказнай базы для расследаванняў, — кажа Людміла Мун. — Дзеці могуць маўчаць гадамі, і, калі нарэшце расказваюць, часта ўжо няма ніякіх матэрыяльных слядоў гвалту. Таму вельмі важна правільна ацэньваць словы дзяцей — гэтаму прысвечана вялікая колькасць навуковых распрацовак. Таму што бываюць выпадкі, калі малыя становяцца інструментам у нейкіх дарослых гульнях, дарослых узаемаадносінах (маюцца на ўвазе сітуацыі, калі дзіця могуць выкарыстоўваць для паклёпу на мужчыну, — такія выпадкі таксама часам сустракаюцца ў судовай практыцы).

Дарэчы, калі вярнуцца да ўжо даказаных злачынстваў, то, паводле статыстыкі, у большасці выпадкаў дзіця ідзе за гвалтаўніком па добрай волі, паддаўшыся на тыя ці іншыя ўгаворы. Справа ў тым, што педафілы часта паводзяць сябе так, што дзіця можа і не адчуць небяспекі, як у апісанай гісторыі ў пачатку артыкула. «Мы знаходзілі нават інструкцыі для патэнцыйных педафілаў, як схіліць дзіця да сексуальнага кантакту, з дапамогай чаго, якімі псіхалагічнымі метадамі... — адзначае Генадзь Казакевіч. — Гэтыя рэкамендацыі і парады дастаткова прадуманыя. І мы можам канстатаваць, што ў нашай краіне існуюць не проста супольнасці педафілаў у інтэрнэце, а і інцэст-супольнасці. Гэтыя людзі паміж сабой камунікуюць».

### Што рабіць з педафіламі?

У Беларусі педафілам пагражае пакаранне да 15 гадоў пазбаўлення волі. Пасля выхаду на волю судзімасць захоўваецца, за педафілам назірае міліцыя, таму што сярод такіх людзей дастаткова высокі працэнт рэцыдыву. Але ці ёсць эфектыўныя метады прадухілення дадзеных злачынстваў і іх паўтораў?

У нашай краіне заканадаўча не прадугледжана прымусовае лячэнне дадзенага захворвання, — гаворыць **начальнік галоўнага ўпраўлення судова-псіхіятрычных экспертыз цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Юрый АСЦЯНКА.** — Але чалавек з такім дыягназам можа звярнуцца па медыцынскую дапамогу, і з яго згоды такая дапамога яму будзе аказана. Што да іншых краін, то існуе розная практыка. Але варта адзначыць, што максімальны эфект ад лячэння магчымы пры ўжыванні не прымусовых мер, а пры забеспячэнні педафілам выбару: напрыклад, адседзець 10 гадоў альбо выйсці праз 5 гадоў і пры гэтым трапіць у спецыяльную праграму лячэння з досыць жорсткімі мерамі, якія ўключаюць у тым ліку хімічную кастрацыю. Паўтаруся: максімальны эфект дасягаецца пры добраахвотнай згодзе на лячэнне.

Што датычыцца праваахоўнікаў, то Генадзь Казакевіч лічыць, што вельмі неэфектыўна вырашаць праблему метадам запалохвання. «Гэта не працуе. Патэнцыйнага педафіла не спыніць артыкул у крымінальным кодэксе, — упэўнены ён. — Таму павінен быць комплекс мер. МУС лічыць, што трэба задзейнічаць усе магчымыя дзяржаўныя органы і грамадскія арганізацыі. Без грамадзянскай супольнасці паспяховае процідзеянне праблеме немагчымае». Дарэчы, Міністэрства ўнутраных спраў ужо выпрацавала пакрокавую стратэгію, разлічаную на некалькі гадоў сістэмнага процідзеяння сексуальнаму і іншым відам гвалту ў дачыненні да дзяцей...

> **«Дачцэ ён здаўся звычайным і добрым дзядзечкам. Ён успрымаўся як ужо знаёмы — толькі таму, што загаварыў з ёю першы раз яшчэ на мінулым тыдні, значыць, не страшны... Ён умее правільна задаваць пытанні і мякка гаварыць — дачка зусім не запомніла яго выгляд, толькі ўзрост і голас. Голас, кажа, быў добры...»**

❍ **Памятка бацькам**

# ЯК АБАРАНІЦЬ СВАЁ ДЗІЦЯ

**Мы папрасілі галоўнага пазаштатнага дзіцячага псіхіятра Міністэрства аховы здароўя Вольгу ЛІТВІНАВУ расказаць, як аберагчы сваё дзіця ад небяспечных дарослых.**

### Якія прыёмы выкарыстоўваюць педафілы?

Такіх прыёмаў мноства. Яны могуць, напрыклад, папрасіць аб дапамозе: дапамажы, калі ласка, знайсці страчанае кацяня або сабачку. Могуць выкарыстоўваць пахвалу. Вельмі часта на гэты прыём «ловяцца» дзеці, якім не хапае бацькоўскай любові і клопату, тыя, каго рэдка хваляць бацькі, дзеці-ізгоі. І тут з'яўляецца дарослы, які пачынае адзначаць іх вартасці, хваліць: ты такі прыгожы, неардынарны...

Такі дарослы можа частаваць прысмакамі і абяцаць яшчэ больш, калі дзіця пагодзіцца пайсці з ім. Можа падарыць цацку, прапанаваць пайсці да яго дадому, каб убачыць нешта цікавае: сапраўднага зайчыка, вожыка і г. д.

### Што важна данесці да дзіцяці

➔ Дапамагаць даросламу павінен дарослы, а не дзіця! Таму незнаёмы дарослы чалавек павінен звярнуцца не да дзіцяці, а да іншага дарослага.

➔ Якую б выдатную цацку ні даваў дзядзька, браць нельга! Браць падарункі можна толькі з рук добра знаёмага чалавека — мамы, таты, сваякоў і найбліжэйшага акружэння.

➔ Калі дзядзька ці цётка прапануе сфатаграфавацца, таму што ты вельмі прыгожы, ты павінен гучна і выразна сказаць «не» і што ты раскажаш пра гэта маме. Наогул вельмі важна навучыць дзіця казаць слова «не», бо многія з іх баяцца сказаць гэта даросламу.

➔ Ніколі нельга паведамляць незнаёмым людзям свой адрас, імя, прозвішча, тэлефон і г. д. Трэба казаць на такую просьбу «Я раскажу пра гэта маме».

➔ Трэба навучыць дзіця выконваць правіла выцягнутай рукі. Вось ты выцягнуў ручку. Ведай: ніхто з незнаёмых дарослых не мае права падысці да цябе бліжэй за тваю выцягнутую руку. Дзіцяці трэба растлумачыць: калі дарослыя парушаюць правіла выцягнутай рукі і табе непрыемна, ты павінен неадкладна гучна казаць «не!».

➔ Навучыць правілу трох крокаў: ты не падыходзіш бліжэй за тры свае вялікія крокі, калі спынілася машына і цябе пачынаюць клікаць. І ніколі не садзішся ў чужую машыну, каб паказаць незнаёмаму даросламу дарогу.

➔ Дарослы можа прыкінуцца знаёмым бацькоў дзіцяці і расказаць гісторыю, напрыклад, пра тое, што тата або мама малога папрасілі забраць яго са школы ці адвезці кудысьці. Нават калі ў вашай сям'і прынята кагосьці прасіць, каб забралі дзіця і г. д., вы павінны навучыць яго слову-паролю. І давяраць толькі таму даросламу, які ведае яго. Напрыклад, дзядзька прыходзіць і кажа: «Мама папрасіла праводзіць цябе на трэніроўку, вось пароль...» Але такі пароль добра развучыць з больш дарослымі дзецьмі, таму што маленькае дзіця можа гэта разбалбатаць і потым паддацца на гэтае ж слова. Таму з гэтым варыянтам таксама трэба быць асцярожным.

➔ Дзіця павінна ведаць аб бяспечных дарослых людзях і бяспечных месцах. Хто такія бяспечныя дарослыя? Гэта настаўнік, доктар, ахоўнік, міліцыянер, вайсковец. Калі раптам дзіця апынулася ў сітуацыі, калі яму патрэбна дапамога, то з усіх людзей на вуліцы ён павінен знайсці бяспечнага дарослага. Калі дзіцяці страшна, яму здаецца, што хтосьці за ім ідзе, трэба ісці ў бяспечнае месца: школу, паліклініку, банк... І ніякіх двароў, пад'ездаў, падваротняў і гарышчаў — там хавацца нельга!

➔ Бацькам вельмі важна разумець усю небяспеку інтэрнэту. Дзіця, якое «завісла» ў інтэрнэце, фактычна адпушчанае ў адзіночнае плаванне. Таму бацькам варта ведаць, на якія сайты яно заходзіць. Для гэтага трэба пабудаваць даверлівыя адносіны, дарыць дзіцяці час і ўвагу, тлумачыць, што знаёмствы ў інтэрнэце можа быць небяспечным, што перапіска павінна быць толькі з людзьмі, якіх яно ведае асабіста, — аднакласнікамі, настаўнікамі і інш.

> **8 801 100-16-11 — нумар агульнанацыянальнай тэлефоннай дзіцячай лініі. Працуе кругласутачна, званок бясплатны, можна патэлефанаваць ананімна.**

➔ Падлеткам трэба растлумачыць, што лепш не абменьвацца сваімі фотаздымкамі, тым больш інтымнымі, у інтэрнэце. Трэба, каб дзеці разумелі: любая інфармацыя, якая выкладзена ў інтэрнэце, можа стаць даступнай для кожнага.

➔ Бацькі павінны ведаць, што цяпер ёсць магчымасць усталяваць паролі, ключы і абмежаваць магчымасць дзіцяці зайсці на пэўныя сайты. Ужо існуюць і абмежаванні па наборы пэўных слоў. Бацькі, якія хочуць абараніць сваіх дзяцей, павінны быць у курсе ўсіх сучасных магчымасцяў, якія існуюць для гэтага.

➔ На жаль, часцяком немагчыма падлетку забараніць сустрэцца з тым, з кім ён пазнаёміўся ў інтэрнэце. Ён усё роўна можа пайсці на спатканне. Але трэба растлумачыць яму, што сустракацца трэба ў бяспечным людным месцы і абавязкова днём.

### Самае галоўнае

Вельмі важна не проста расказаць дзіцяці аб гэтых правілах, але і патрэніравацца, як яно будзе сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі. Пагуляць з ім, каб замацаваць патрэбныя паводзіны.

І самае галоўнае: у бацькоў павінны быць даверлівыя адносіны з дзіцем. Чаму малыя часам доўга хаваюць нейкія факты? Таму што баяцца. Педафіл можа «згуляць» на пачуцці сораму, страху... Дзіця павінна ведаць, што яно пра ўсё можа расказаць сваім бацькам і што на яго не будуць сварыцца, яно знойдзе ў бацькоў дапамогу і абарону ■

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

# ВЯСНА ІДЗЕ, А З ЁЮ — АЛЕРГІЯ

## Як адрозніць паліноз ад прастуды і пазбегнуць непрыемных сезонных праяў

**Разам з першым вясновым сонцам да некаторых з нас прыходзяць і не вельмі прыемныя адчуванні, так званая сезонная алергія, або паліноз.**



Яго прычына — у цвіценні раслін. Хтосьці вінаваціць тапаліны пух, хтосьці пылок кветак, але так ці інакш — насмарк, закладзены нос, слёзы з вачэй і іншыя прыкметы недамагання сур'ёзна псуюць настрой і не самым лепшым чынам уплываюць на працаздольнасць і самаадчуванне. Як у поўным узбраенні сустрэць вясну і мінімізаваць праяўленні алергіі?

— Сезонная алергія строга супадае з батанічнымі фазамі, — кажа **дацэнт кафедры геранталогіі і герыятрыі з курсам алергалогіі і прафілактыкі БелМАПА, галоўны пазаштатны алерголаг Міністэрства аховы здароўя Таццяна БАРАНОЎСКАЯ**. — Першая фаза — гэта канец сакавіка — пачатак красавіка. Другі пік прыходзіцца на красаванне злакаў, трэці наступае ў канцы лета, калі цвітуць палыновыя травы і пустазелле. Хтосьці пакутуе ад цвіцення толькі ўвесну, хтосьці — на працягу ўсяго лета, аж да першых маразоў.

На жаль, не ўсе могуць адрозніць алергічныя праяўленні ад банальнай прастуды і часта спісваюць на апошнюю непрыемныя сімптомы. Ці проста не звяртаюць ніякай увагі на насмарк. На самай справе першы крок да распазнання алергіі трэба зрабіць самому і задумацца: калі прастуда прыходзіць у адзін і той жа час, вясной ці летам, магчыма, так маскіруецца штосьці іншае з падобнымі сімптомамі. Калі недамаганне з'яўляецца раптоўна, без яўнай прычыны, узмацняецца падчас выхаду на вуліцу і асабліва выезду на прыроду, вяртаецца з пэўнай перыядычнасцю, доўга не праходзіць, нягледзячы на супрацьвірусначае лячэнне, хутчэй за ўсё, гэта алергія. І тут важна звярнуцца да алерголага. Ён і толькі ён павінен накіраваць вас на неабходныя абследаванні.

— Мы часта назіраем, што пацыентаў больш турбуе, з-за чаго развілася хвароба, а не як ад яе пазбавіцца, — кажа Таццяна Бараноўская. — Зараз шмат медыцынскіх цэнтраў на платнай аснове прапаноўваюць розныя тэсты. Але сапраўдная каштоўнасць такой дыягностыкі куды ніжэйшая. Сёння вы можаце атрымаць адзін адказ, заўтра — іншы. Кожны арганізм у розны час рэагуе па-свойму, і не ўсялякая рэакцыя азначае наяўнасць хваробы. Таму найперш трэба самім быць уважлівымі да свайго арганізма.



Калі ж вы дакладна ведаеце, што алергія прыходзіць да вас разам з першымі прыкметамі вясны, лепш падрыхтавацца. Гэта захворванне носіць хранічны характар, і пазбавіцца ад яго цалкам не ўдасца. Але ўрачы ўсё ж раяць быць уважлівымі і пры першых прыкметах хваробы пачаць прыём антыгістамінных прэпаратаў. Яны прыглушаюць сімптомы алергіі і валодаюць седатыўным эфектам.

**А вось некалькі правілаў, прытрымлівацца якіх абавязкова павінны тыя, хто мае алергію. Па-першае, часцей умывацца. Па-другое, часта мяняць адзенне, бо на ім асядаюць алергены, якія, адпаведна, падтрымліваюць праяўленне сімптомаў. Можна выкарыстоўваць хатнія фільтры, якія ачышчаюць паветра ад мікрачасцінак пылку. Насіць акуляры, якія прыкрываюць слізістую вачэй.**

— Калі лячэнне прызначана, важна захоўваць яго рэгулярнасць, — падкрэслівае Таццяна Бараноўская. — Кожны перажыты эпізод выклікае ў арганізме сапраўдную буру, якая можа мець цяжкія наступствы, а хвароба будзе толькі ўзмацняцца. Цярпець нават банальны насмарк не трэба. Пры больш сур'ёзных праявах можна выкарыстоўваць гармальныя спрэі для носа, інгаляцыі, але толькі ў тым выпадку, калі іх прызначыў урач. Правільна прызначанае лячэнне будзе стрымліваць развіццё хваробы.

Існуе і спецыфічная імунатэрапія. Яе сутнасць заключаецца ў тым, што пасля дыягностыкі і выяўлення алергіі пацыенту прызначаюць дазіраваны прыём тых рэчываў, якія яе правакуюць. Дозы паступова павялічваюць. І вось пасля поўнага курса вакцынацыі, сустракаючыся з алергенам у звычайным жыцці, арганізм на яго папросту не рэагуе. Звычайна працягласць такой тэрапіі складае ад трох да пяці гадоў. А перыяд рэмісіі доўжыцца да васьмі гадоў.

— Раней такую вакцынацыю выконвалі толькі падскурна і не ў сезон цвіцення, — расказвае **загадчык алергічнага аддзялення 4-й дзіцячай клінічнай бальніцы, галоўны нештатны дзіцячы алерголаг Міністэрства аховы здароўя Дзмітрый БУЗА**. — Цяпер з'явілася альтэрнатыва ў выглядзе таблетак і кропель, а вакцына можа прызначацца не толькі да пачатку сезону цвіцення, але і падчас яго. У адрозненне ад сімптаматычнага метаду лячэння, які толькі пазбаўляе ад знешніх праяў алергіі, алерген-спецыфічная імунатэрапія дазваляе перабудаваць работу імуннай сістэмы. Паводле статыстыкі, эфектыўнасць такога метаду складае каля 80 %. Гэта і паляпшэнне якасці жыцця, і алергія не пераходзіць у больш цяжкія формы.

Праўда, прызначыць алергавакцынацыю можа толькі спецыяліст, ацаніўшы неабходнасць яе прымянення, паколькі гэты метад мае шэраг супрацьпаказанняў. І праводзіцца яна толькі здароваму чалавеку. У перыяд абвастрэння алергіі ці падчас прастуды такі метад лячэння выкарыстоўваць нельга.

А вось некалькі правілаў, прытрымлівацца якіх абавязкова павінны тыя, хто мае алергію. Па-першае, часцей умывацца. Па-другое, часта мяняць адзенне, бо на ім асядаюць алергены, якія, адпаведна, падтрымліваюць праяўленне сімптомаў. Можна выкарыстоўваць хатнія фільтры, якія ачышчаюць паветра ад мікрачасцінак пылку. Насіць акуляры, якія прыкрываюць слізістую вачэй.

**Калі недамаганне з'яўляецца раптоўна, без яўнай прычыны, узмацняецца падчас выхаду на вуліцу і асабліва выезду на прыроду, вяртаецца з пэўнай перыядычнасцю, доўга не праходзіць, нягледзячы на супрацьвіруснае лячэнне, хутчэй за ўсё, гэта алергія.**

Як адзначыў Дзмітрый Буза, прафілактыку алергічных захворванняў у дзяцей трэба праводзіць яшчэ з перыяду цяжарнасці маці. Спецыялісты павінны высвятляць, ці пакутуюць на алергіі блізкія дзіцяці, а цяжарная жанчына займацца прафілактыкай — выключыць курэнне, у тым ліку і пасіўнае, кантакт з пылам, шэрсцю хатніх жывёл, прадукты ў вялікай колькасці, якія могуць выклікаць алергію.

**Найбольш распаўсюджаным алергічным захворваннем з'яўляецца алергічны рыніт. На яго пакутуе 15—20 % насельніцтва. Яго сімптомы мы адчуваем, напрыклад, падчас прыборкі, але вельмі нямногія звяртаюцца да ўрача. У дзіцячым узросце з алергічным рынітам на ўліку ў медыкаў знаходзіцца 1-2 % малых. Больш грознае алергічнае захворванне — бранхіяльная астма, і дзяцей з любымі формамі такой хваробы абавязкова бяруць на ўлік. У Мінску каля 1,5 % дзяцей маюць гэта дыягназ, у рэспубліцы — каля 1 %. У нашых суседзяў, дарэчы, гэтыя лічбы большыя — каля 5-10 %.**

**Яшчэ адно алергічнае захворванне — атапічны дэрматыт, найчасцей сустракаецца ў дзяцей. Яго агульная распаўсюджанасць невялікая — усяго 1,5-2 %. А вось у дзяцей у першыя тры гады жыцця яно сустракаецца ў 30—40 %. І тут ўрачы раяць бацькам не настойліва шукаць алерген, а наладзіць правільны догляд скуры. Часцей за ўсё, з узростам атапічны дэрматыт знікае.**

# Смяротнасць ад сардэчна-сасудзістых хвароб знізілася

**Сардэчна-сасудзістыя хваробы штогод забіраюць жыцці 17 мільёнаў жыхароў планеты. І з'яўляюцца прычынай трэці ўсіх смяротных выпадкаў.**

Але наша здароўе, як сцвярджаюць спецыялісты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на палову залежыць ад ладу жыцця. Калі скарэктаваць сваё паводзіны, то рызыку ўзнікнення сардэчна-сасудзістых хвароб можна знізіць на 80 %, анкалагічных — на 40 %.

У прафілактыцы названых хвароб найбольшае значэнне маюць наша харчаванне, наяўнасць фізічнай актыўнасці, узровень глюкозы і халестэрыну. Негатыўна ўплываюць на сэрца сядзячы лад жыцця і вялікая колькасць солі ў рацыёне. Паводле інфармацыі **загадчыка лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі РНПЦ «Кардыялогія» кандыдата медыцынскіх навук Вольгі ПАЎЛАВАЙ**, беларусы ў сярэднім ужываюць 10 грамаў солі ў суткі, што ў два разы перавышае норму. Знішчаюць сэрца і нашы шкодныя звычкі — курэнне і ўжыванне алкаголю. Між іншым, у нашай краіне курыць амаль кожны дарослы мужчына, а Беларусь адносіцца да краін з вялікай распаўсюджанасцю тытунекурэння.

У Беларусі захваральнасць сардэчна-сасудзістай сістэмы летась складала 34 527 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва, пазалетась гэты паказчык быў крыху меншы — 33 112. Аднак, сцвярджае спецыяліст, гэта азначае не павелічэнне колькасці хворых, а лепшую выяўляльнасць. Больш красамоўны паказчык — доля сардэчна-сасудзістых хвароб у структуры смяротнасці. Ён год ад году не мяняецца і складае каля 55 %.

— Беларусь па-ранейшаму адносіцца да краін з высокім узроўнем смяротнасці ад сардэчна-сасудзістых хвароб, — адзначае Вольга Паўлава. — Зрэшты, як і астатнія краіны СНД.

У той жа час наша краіна сярод лідараў у СНД па аказанні медыцынскай дапамогі пацыентам з парушэннямі рытмаў сэрца, у прыватнасці, штогод у нас імплантуецца больш за 320 кардыястымулятараў на 1 мільён насельніцтва, што вышэй за аналагічны паказчык у іншых краінах СНД. Дарэчы, гэты паказчык падвоіўся менавіта за апошнія 10 гадоў.

— Дынаміка развіцця тэхналогій і аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з парушэннямі сардэчнага рытму вельмі змянілася ў апошнія гады, — падкрэсліў **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі парушэння рытму сэрца РНПЦ «Кардыялогія» кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр ЧАСНОЙЦЬ**. — Тэмпы развіцця ў нас вельмі высокія. І нягледзячы на тое, што выяўляльнасць сардэчна-сасудзістых хвароб павялічваецца, смяротнасць паступова зніжаецца за кошт развіцця ўсіх напрамкаў кардыялогіі, у тым ліку прафілактычных, тэрапеўтычных і кардыяхірургічных.

За апошнія сем гадоў, дарэчы, гэты паказчык знізіўся на 13 %. Калі ў 2011-м ён складаў 741 выпадак на 100 тысяч насельніцтва, то ў 2017-м — 696. Прычым істотна знізілася смяротнасць сярод працаздольных грамадзян — на 25 %.

Паводле слоў **намесніка дырэктара па хірургічнай дапамозе РНПЦ «Кардыялогія» доктара медыцынскіх навук Сяргея СПІРЫДОНАВА**, у Беларусі выконваецца вялікая доля кардыяхірургічных аперацый з мэтай аднаўлення кровазабеспячэння міякарду жалудачка і лячэння ўскладненняў у пацыентаў з сардэчнай недастатковасцю пасля інфаркту. А па колькасці трансплантацый сэрца наша краіна традыцыйна займае першае месца ў СНД. Штогод у нас робіцца ад 40 да 50 такіх аперацый пацыентам з тэрмінальнай сардэчнай недастатковасцю пры ўмове, што чаканая працягласць іх жыцця складае менш за год.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# АБ ЧЫМ ЗВАНЫ ХАЦЫНІ

**«ЗВЯЗДА»:**

***— З дня хатынскай трагедыі мінула 75 гадоў. Ці не ёсць такі адрэзак часу адпраўной кропкай, калі ўспрыняцце падзей, якія былі нядаўна, але ж ужо і даўно, можа ў свядомасці людзей мяняцца, асабліва пад уплывам знешніх фактараў. Калі не застаецца жывых сведак, прытупляецца і боль? Хатынь сёння ў свядомасці многіх перастала быць спаленай вёскай, у якой гарэлі жывыя рэальныя людзі, дзеці, старыя... Цяпер гэта проста сімвал мінулай вайны, якая была задоўга да нараджэння сённяшніх маладых пакаленняў. І нашы дзеці ў сацыяльных сетках абсалютна шчыра, з найлепшых пабуджэнняў пішуць, што хутка будзем адзначаць (святкаваць) юбілей хатынскай трагедыі...***

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ:**

— Менавіта таму мы павінны казаць сёння не толькі пра трагедыю Хатыні і іншых знішчаных беларускіх вёсак, але і перасцерагчы грамадскую думку ад мэтанакіраванай фальсіфікацыі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Сёння назіраецца небывалы і свядомы перагляд не толькі найважнейшых геапалітычных вынікаў вайны, але і маральна-этычных вынікаў перамогі над нацызмам. На нашых вачах адбываецца не проста рэвізія вынікаў Другой сусветнай вайны, але і рэабілітацыя злачынных ідэалогій, іх інстытуцыянальнае адраджэнне і легалізацыя...

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:**

— Безумоўна, 75 гадоў — тэрмін даволі значны. Тым больш што зараз сапраўды ў свеце — а мы не можам ізалявацца ад свету — гісторыя мінулай вайны актыўна перапісваецца, скажаюцца факты, дадаецца нічым не пацверджаная інтэрпрэтацыя тых падзей. Аддзел ваеннай гісторыі ў нашым інстытуце, цэнтральная тэма якога — гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, фактычна застаецца на сёння адзіным такім спецыялізаваным навуковым падраздзяленнем на ўсёй постсавецкай прасторы. Беларускімі вучонымі дзеля таго, каб памяць і праўда аб той страшнай вайне захавалася, робіцца шмат, рыхтуецца грунтоўныя працы. Але мы разумеем, што навуковымі даследаваннямі можна зацікавіць толькі абмежаванае кола людзей, таму робім усё магчымае, каб факты, сведчанні, памяць аб вайне знайшлі водгук у грамадстве. Мы штогод праводзім рэгіянальныя канферэнцыі, на кожнай з якіх абавязкова ўздымаецца тэма Вялікай Айчыннай вайны. На гэтыя мерапрыемствы прыцягваецца вучнёўская, студэнцкая моладзь, яны самі рыхтуюць адпаведныя матэрыялы, паведамленні, і значная іх частка прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай...

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— Сорак дзевяць гадоў назад на месцы спаленай беларускай вёскі быў створаны самы несавецкі з савецкіх помнікаў — там не было вялікіх фігур салдат, там не было духу мілітарызму — быў толькі скамянелы, але жывы чалавечы боль. Магчыма, сёння гэты боль сапраўды не заўсёды адчуваецца. Сама вайна перастала ўспрымацца як боль. Вайна ўспрымаецца амаль як гульня: гэта ж так цікава — «танчыкі», стралялкі. Ужо ніхто не тое што не ведае, а менавіта не адчувае, што вайна — гэта кроў, гэта страх, гэта жах... Добра, канешне, што выдаюцца навуковыя працы, зборнікі дакументаў, але, на жаль, пры ўсёй іх прабіўной сіле яны мала значаць для грамадскасці, бо людзей, якія іх чытаюць, няшмат. Мемарыялы, музеі ў гэтым плане іграюць больш значную ролю, пагадзіцеся. Несумненна, вельмі патрэбна пашыраць і працягваць працу навуковую, працаваць са сведкамі, якіх застаецца ўсё менш. І гэта вельмі важны момант, таму што гадоў трыццаць-сорак назад гэта можна было рабіць лёгка, без праблем, але, давайце будзем шчырымі, хто асабліва гэтым займаўся, акрамя некалькіх пісьменнікаў і журналістаў... Але вельмі важна і пашыраць веданне пра жахі той вайны і ў самых простых, даступных, папулярных формах. І Хатынь застаецца адной з такіх формаў. У Хатынь сёння людзі едуць. За мінулы год мемарыял наведалі 226 тысяч чалавек.

**Ірына ВАРАНКОВА:**

— Варта заўважыць, што праблема захавання памяці пра вайну ў маладога пакалення ўзнікла не сёння. Як толькі з'явіліся на свет і выраслі дзеці, якія вайны не бачылі і не перажылі, гэта праблема стала актуальнай. Магчыма, гэта адбывалася таму, што мы спрабавалі дастукацца да пачуццяў людзей (а тут важныя менавіта эмоцыі) не праз той матэрыял. Я доўгі час працавала ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і займалася ў тым ліку і гісторыяй стварэння самога музея. План камплектавання фондаў музея стваралі яшчэ ў 1942 годзе кіраўнікі БССР, і нават сёння ўражвае, як прафесійна гэта было зроблена. У тым плане пераважалі дзве тэмы: трагедыя беларускага народа падчас акупацыі і партызанскі рух. Але потым, у пачатку 60-х гадоў — і гэта добра прасочваецца па музейных дакументах, па паступленнях у фонды, — крэн быў узяты на гераізм, а трагедыя засталася на другім плане. Галоўнай тэмай музейнай экспазіцыі стаў менавіта подзвіг беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта адбілася ў той час і на камплектаванні музейных фондаў. Гераіка павінна была пераважаць, але, на жаль, у многіх момантах яна ілюстравалася толькі фотапартрэтамі саміх герояў...

А вось з трагедыяй было не ўсё проста нават у гады стварэння музея. Так, былі жывыя сведкі тых страшных падзей, менавіта дзякуючы іх успамінам устанавілі нават імёны многіх ахвяр. І першая кніга ўражанняў музея — гэта сапраўдная кніга ўспамінаў. Але было і іншае. Напрыклад, на месцы Трасцянецкага лагера, дзе заставаліся яшчэ нават бярвенні, на якіх фашысты спальвалі целы забітых, меркавалася зрабіць філіял музея. Уяўляеце, якой бы моцнай па эмацыянасці была гэта экспазіцыя пад адкрытым небам! Але, калі ўзяліся, высветлілася, што Трасцянецкі лягсаг ужо спаліў тыя бярвенні... І доўгі час у Трасцянцы стаяў сціплы помнік...

**Аляксей ЛІТВІН:**

— А вы не задумваліся, чаму так здарылася, што павінна было прайсці дваццаць гадоў, каб загаварылі пра спаленую вёску і пачалі ствараць сімвалічны мемарыял? Дагэтуль, як сказала мая калега, галоўнай тэмай было ўшанаванне памяці тых, хто змагаўся і загінуў на тэрыторыі Беларусі. Але ў 1963 годзе адбылася 3-я Міжнародная канферэнцыя па гісторыі руху Супраціўлення ў Карлавых Варах, да якой было прымеркавана выданне зборніка «Злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі 1941—1944 гг.», у якім, а таксама падчас канферэнцыі, беларусы ўпершыню заявілі аб генацыдзе, які чынілі фашысты на нашай зямлі, ахвярамі якога сталі сотні тысяч мірных жыхароў. У 1965 годзе выйшла 2-е дапоўненае выданне. Зборнік атрымаў шырокі рэзананс як у СССР, так і за яго межамі. Дзякуючы чаму тэма знішчэння беларускіх вёсак упершыню атрымала шырокае асвятленне. Выданне зборніка мела асаблівую актуальнасць у сувязі з прыняццем у ФРГ закона аб спыненні пераследу нацысцкіх злачынцаў «у сувязі з заканчэннем тэрміну даўнасці» праз дваццаць гадоў пасля вайны.

У сувязі з гэтым кіраўніцтва БССР у тэрміновым парадку выступіла з рэзкім асуджэннем такога рашэння ўрада ФРГ. Каб зафіксаваць гэты жах на доўгія гады не толькі дакументальна, але і манументальна, у студзені 1966 года Прэзідыум ЦК КПБ прыняў пастанову аб устанаўленні мемарыяльных знакаў на месцы спаленай вёскі Хатынь, адкрыцці тут філіяла Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Пастанова аб стварэнні мемарыяла ў Хатыні стала штуршком для разгортвання вялікай даследчыцкай працы. Гісторыкі паехалі па рэгіёнах падымаць дакументы, апытваць сведак, бо не было дакладнай інфармацыі: колькі вёсак было спалена, дзе канкрэтна яны знаходзіліся...

У 1945 годзе на Беларусі працавала Дзяржаўная надзвычайная камісія, паводле заключэння якой у Беларусі было знішчана 209 гарадоў і 9200 вёсак. Калі пачалі рабіць Хатынскі мемарыял, знайшлі звесткі толькі аб 5295 паселішчах... На сённяшні час, дзякуючы дзейнасці супрацоўнікаў Дзяржаўнага нацыянальнага архіва і ў прыватнасці Вячаслава Селяменева, мы маем звесткі пра 9093 спаленыя вёскі...

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— Звычайна Хатынь успрымаюць або як помнік знішчанай фашыстамі вёскі, або як помнік усім беларускім спаленым вёскам.



Аляксандр КАВАЛЕНЯ.



Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.



Аляксей ЛІТВІН.

Прынамсі такая думка распаўсюджана і ў грамадстве, і ў СМІ, і сярод навукоўцаў. Але гэта не зусім так, бо Хатынь — гэта не толькі помнік адной або ўсім спаленым вёскам. Гэта помнік усім мірным людзям, якія сталі ахвярамі палітыкі нацызму, акупацыі. Хатынь — гэта і Трасцянец, і Азарычы, і Чырвоны Бераг...

**Аляксей ЛІТВІН:**

— Да 1990 года на Беларусі было пастаўлена 8800 помнікаў. З іх — 3533 загінулым воінам, 2255 — загінулым партызанам, і толькі 1378 — ахвярам фашысцкага генацыду. Тысячы спаленых вёсак не абазначаны ніякім чынам. І даведацца пра іх месцазнаходжанне сёння вялікая, амаль невырашальная праблема. І яна яшчэ ўскладняецца тым, што за пасляваенныя гады вялізная колькасць вёсак, жыхары якіх або іх нашчадкі маглі памятаць, дзе было суседняе спаленае немцамі паселішча, проста перасталі існаваць.

Не менш значная праблема — захаваць памяць пра тыя вёскі, якія вядомыя. Што ведаем мы нават пра 185 сясцёр Хатыні — тыя, што былі спаленыя і не адрадзіліся, чые назвы ўвекавечаныя ў Хатыні? Яны ўсе належным чынам павінны быць адзначаны на месцах іх знаходжання. У раёнах кожны школьнік павінен ведаць аб трагічным лёсе сясцёр Хатыні...

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Мемарыялы і музеі, якія дзейнічаюць сёння, стаяць перад няпростым пытаннем. Стараючыся дастукацца да сучаснай публікі, да яе патрэб, як захаваць сакральнасць памяці пра вайну, як не пераступіць мяжу? Не ствараць жа аб хатынскай ці трасцянецкай трагедыі інтэрактыўную гульню...***

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— Ёсць тое, што не падлягае сумненням, і мяняцца не будзе ні ў якім разе, — гэта сам мемарыял, які ўжо сапраўды стаў своеасаблівым храмам пад адкрытым небам. У Хатыні вельмі цяжка прымяняць аўдыягіды, таму што інфармацыя падаецца сухім тонам, а тут патрэбны эмоцыі, за якімі людзі сюды найперш і едуць.

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Але ж ёсць і іншыя спосабы данесці сучаснай публіцы інфармацыю, і гэтым карыстаюцца музеі ва ўсім свеце. Напрыклад, у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў экспазіцыю, прысвечаную спаленым вёскам, уваходзіш, нібы ў сапраўднае полымя. Здаецца, гэта ўзрушыць і прымусіць хоць на секунду ад жаху заплюшчыць вочы кожнага...***

**Марыя ГАРЭЛІКАВА:**

— Цэнтральнае месца экспазіцыі залы «Нацысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі» займае інсталяцыя «Спаленыя вёскі». Экспануюцца абгарэлыя бярвенні і сельскагаспадарчыя прылады з вёскі Хатынь, макет зруба калодзежа, у які падчас карнай аперацыі ў вёсцы Шунеўка Докшыцкага раёна гітлераўцы кінулі дзяцей і настаўніцу. Побач — калодзежны журавель з вёскі Літавец Дзяржынскага раёна, якая была спалена разам са 196 жыхарамі ў студзені 1943 года. Усе прадметы наведвальнік бачыць на фоне рэалістычных кадраў з фільма Элема Клімава «Ідзі і глядзі», калі карнікі заганяюць жыхароў вёскі ў адрыну... На жаль, усё менш застаецца жывых сведак, якія маглі б расказаць пра тыя трагічныя падзеі. Аднак пры дапамозе інфармацыйнага тэрмінала «Спаленыя вёскі» наведвальнік мае магчымасць пачуць аўдыязапіс успамінаў сведак спалення вёсак. Напрыклад, «жывы голас» Марыі Кот — сведкі знішчэння вёскі Вялікія Прусы Мінскай вобласці. Аўдыявізуальныя сродкі спрыяюць больш эмацыянальнаму ўспрыманню тэмы, якая да сённяшняга часу працягвае кранаць душы людзей. У кнізе водгукаў наведвальнікі пішуць, што менавіта ў гэтай зале зашкальваюць эмоцыі, а на вачах з'яўляюцца слёзы...

Але, на жаль, так рэагуюць не ўсе. Дзеці і падлеткі, здараецца, пачынаюць рабіць у зале акупацыі сэлфі. Аднак тут больш пытанняў да дарослых, з якімі яны прыйшлі, да выхавання дзяцей у сям'і. Мне здаецца, варта разумець, найперш дарослым — і настаўнікам, і бацькам, што экскурсія ў наш музей, паездка ў Хатынь — гэта не забаўляльная прагулка. Мы ўдзячны тым неабыякавым настаўнікам, якія прывозяць да нас на экскурсію школьнікаў не толькі дзеля таго, каб у справаздачы аб пазакласнай рабоце паставіць яшчэ адну галачку... Для ўспрымання такой складанай і трагічнай тэмы як спаленыя вёскі ў гады вайны дзяцей трэба рыхтаваць, настройваць. Напрыклад, перад уваходам у залу неабходна папярэдзіць, што побач з такімі трагічнымі экспанатамі нельга смяяцца. Некалькі слоў, прыкладаў — і можна змяніць адносіны да тэмы, бо дзіцячая душа яшчэ не ачарсцвелая. Праца з моладдзю патрэбна зараз і для таго, каб яны захавалі і здолелі перадаць сваім дзецям разуменне таго, што такая трагедыя не павінна паўтарыцца. А для гэтага трэба ўспамінаць Хатынь не толькі ў чарговую «юбілейную» гадавіну знішчэння, неабходна ствараць сучасныя творы мастацтва, спектаклі, фільмы, пасля знаёмства з якімі ў музей прыйдзе наведвальнік, эмацыянальна падрыхтаваны да ўспрымання матэрыялу. Прыцягваць увагу розных пакаленняў, не абавязкова моладзі, можна толькі праз лёсы канкрэтных людзей. Калі проста фіксаваць факты сухой акадэмічнай мовай, што ў пэўную дату адбылося тое і тое, была знішчана такая колькасць людзей — такая статыстыка не кране нікога.

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— Калі наведвальнікам Хатыні пачынаеш расказваць, што Толіку Яскевічу, які згарэў разам з маці, было ўсяго сем тыдняў, бачыш, як у многіх людзей на вачах наварочваюцца слёзы...

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Але, наколькі вядома, паездка ў Хатынь, экскурсія ў музей гісторыі вайны, у Брэсцкую крэпасць цяпер у прагараме школьнага навучання не абавязковая, хоць некалькі гадоў таму ў Міністэрстве адукацыі агучвалася ідэя зрабіць менавіта так...***

**Марыя ГАРЭЛІКАВА:**

— Не, сёння гэта неабавязкова. Таму, каб данесці сапраўдную інфармацыю пра вайну для большай колькасці моладзі, мы актыўна працуем там, дзе моладзь сёння праводзіць шмат часу, — у сацыяльных сетках. Напрыклад, нядаўна мы распачалі праект «Галасы з пажаўцелых старонак». У фондах музея захоўваецца вельмі шмат запісаных успамінаў сведак аб подзвігах і жахах той вайны. Саміх сведак ужо няма ў жывых, але іх успаміны гучаць цяпер на відэа — іх чытаюць нашы супрацоўнікі. Праект толькі распачаўся, а некаторыя сюжэты ўжо набралі па дзесяць тысяч праглядаў...

**Ірына ВАРАНКОВА:**

— Сапраўды, нават калі няма сведак, ёсць дакументы. У музеі гісторыі вайны захоўваецца ўнікальная калекцыя асабістых лістоў — дзве з паловай тысячы. І за кожным з іх — канкрэтныя чалавечыя пачуцці, чалавечыя лёсы.

**Аляксей ЛІТВІН:**

— Вядома, што ў нас у фондах радыё і тэлебачання захаваліся аўдыя- і відэазапісы ўспамінаў менавіта саміх сведак.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЗВОНЯЦЬ СЁННЯ?


Ірына ВАРАНКОВА.


Артур ЗЕЛЬСКІ.


Марыя ГАРЭЛІКАВА.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Калі б выкарыстоўваць іх у музейных экспазіцыях, калі б рабіць іх частка́і запісаў аўдыягіда — эфект, думаю, быў бы вельмі моцны...

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ:**

— Як, дарэчы і зачытаныя ўрыўкі з кнігі «Говорят погибшие герои. Предсмертные письма борцов с фашизмом», якая была выдадзена яшчэ ў часы СССР і вытрымала дзевяць перавыданняў. Не павінны пакінуць раўнадушнымі сённяшніх 17—19-гадовых словы іх равесніцы са Слуцка, якая загінула ў нацысцкіх засценках: «Боря, нас ночью убьют; поганые чувствуют, что им скоро конец. Я им в лицо сказала, что наша возьмет. Боря, ты меня прости, что я тебя огорчила. Знаешь, не всегда так говоришь и делаешь, как хочется, а я тебя так люблю, так люблю, что не умею сказать. Боря, я сейчас прижалась к тебе, и ничего мне не страшно, пусть ведут. Вчера, когда очень били, я про себя повторяла: «Боренька», а им ничего не сказала — не хочу, чтобы они слышали твое имя. Боренька, ты прощай, спасибо тебе за все».

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:**

— Мне падаецца няправільным, што наведванне знакавых месцаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, не з'яўляецца ў школах абавязковым. Калі пусцім гэта на самацёк, калі нашы дзеці не ўбачаць Хатынь ці Брэсцкую крэпасць падчас школьнай экскурсіі, яны знойдуць інфармацыю пра іх у інтэрнэце. Але ў якой падачы — вось у чым пытанне... У гэтым кантэксце ідэя музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з сацыяльнымі сеткамі сапраўды цікавая і сучасная. Мне здаецца, не менш увагі прыцягнулі б выставы з музейных экспанатаў у розных рэгіёнах краіны...

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ:**

— А яшчэ варта было б на дзяржаўным узроўні аб'явіць 22 сакавіка, дзень Хатынскай трагедыі, Днём нацыянальнай памяці і смутку. У беларусаў, якія ў той вайне страцілі кожнага трэцяга, павінен быць такі дзень. Каб кожны, хто жыве на гэтай зямлі сёння, успомніў і задумаўся...

**«ЗВЯЗДА»:**

***— На пачатку 90-х асобныя рупліўцы спрабавалі культываваць думку аб тым, што жыхары Хатыні і іншых спаленых вёсак сталі ахвярамі не фашысцкай нялюдскай ідэалогіі, а масіўнага партызанскага руху, у адказ на які і праводзіліся карныя аперацыі. Маўляў, сядзелі б ціха, былі б мірныя жыхары жывыя. Тады гэтыя меркаванні вельмі хутка сціхлі, у тым ліку дзякуючы сведкам. Але сёння, калі на вачах перапісваецца гісторыя, падобныя «меркаванні» пачынаюць гучаць зноў.***

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ:**

— Гэта быў загадзя распрацаваны, абдуманы і мэтанакіраваны план генацыду, рабавання нацыянальнага багацця краіны, ліквідацыі дзяржаўнага ладу. Такіх злачынстваў, якія чынілі акупанты, па сваёй жорсткасці, бесчалавечнасці і масавасці не ведала гісторыя. Вось факты першых дзён акупацыі, калі аб партызанскім руху гаварыць яшчэ не даводзілася. У ліпені 1941 года паліцэйскі полк «Цэнтр» арганізаваў карную акцыю ў Белавежскай пушчы і прылеглых да яе раёнах, у ходзе якой спалена 34 населеныя пункты. Падчас правядзення аперацыі «Прыпяцкія балоты» ў ліпені—жніўні 1941 года спалены наступныя вёскі: Хатынічы Ганцавіцкага раёна (знішчаны 73 чалавекі); Запясочча (300 чалавек), Пагост (69 чалавек), Рыдча (26 чалавек), Старажоўцы (30 чалавек), Чэрнічы (40 чалавек) Тураўскага раёна; Вялікая Гаць (123 чалавекі), Святая Воля (436 чалавек) Косаўскага раёна; Асташкавічы (120 чалавек), Славень (72 чалавекі) Парыцкага раёна; Боркі, Выброды, Глушэц, Залессе, Клетнае, Радзецк (13 чалавек), Чадзель (38 чалавек), Хідры Пружанскага раёна...

**«ЗВЯЗДА»:**

***— А ці ведаюць пра гэту страшную праўду як мінімум тыя, хто наведвае Хатынь?***

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— Наш мемарыял адчынены для ўсіх у любы час сутак, у яго не прадаюцца ўваходныя квіткі. Прычым большасць наведвальнікаў тыя, хто прыязджае самастойна. Мала хто з іх замаўляе экскурсіі — яны прыязджаюць менавіта паглядзець. Яны атрымліваюць эмоцыі — гэта несумненна, Хатынь уздзейнічае на кожнага, але не ўсе атрымліваюць інфармацыю... Хатыні сёння вельмі не хапае музейнага памяшкання, дзе можна было б уражанні ад мемарыяла ўмацніць ведамі аб генацыдзе, які праводзілі нацысты на нашай зямлі...

Групы, у тым ліку і замежных турыстаў, нярэдка прыязджаюць са сваімі замоўленымі экскурсаводамі, і мы не можам кожны раз адсачыць, што тыя экскурсаводы пра хатынскую трагедыю ім гавораць, у якім ключы падаюць... Мы спрабавалі паўплываць на сітуацыю, давалі тэкст экскурсіі ў Нацыянальнае агенцтва па турызме, якое і курыруе экскурсаводаў, але, наколькі яны, нават здаўшы «залік», падчас экскурсій прытрымліваюцца нашага тэксту, адсачыць досыць складана.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:**

— Мы ўсведамляем, што гэта сапраўды праблема. І разам з Міністэрствам спорту і турызму на бліжэйшы час запланавалі семінар экскурсаводаў, якія працуюць на тэрыторыі Беларусі менавіта з фактурай па Вялікай Айчыннай вайне. Будзем расказваць ім, як працаваць, каб пазбегнуць у сваіх экскурсійных аповедах скажэння і фальсіфікацыі.

**Аляксей ЛІТВІН:**

— Увогуле не пашкодзіла б прафесійным гісторыкам азнаёміцца з тэкстамі экскурсій, якія сёння праводзяцца. Магчыма, трэба задумацца пра тое, каб на экскурсію, асабліва па тэме Вялікай Айчыннай, выдавалася адпаведная ліцэнзія, і толькі тады чалавек меў бы права яе праводзіць...

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— А так часам у Хатыні даводзіцца чуць, як вёску спалілі ўкраінцы.

**Аляксей ЛІТВІН:**

— Хоць на ўсіх дакументах Хатынь спаліў 118-ы шуцманшафт-батальён СС. Трэба разумець, што гэта было менавіта нямецкае фарміраванне, а людзі якіх нацыянальнасцяў у іх служылі, гэта ўжо не так важна, бо здраднікі і калабаранты ёсць у кожнай вайне. Увогуле вось так употай ідзе нацкоўванне: маўляў, пад эгідай СС дзейнічалі ўкраінцы, рускія, беларусы, палякі — хто заўгодна, толькі не немцы, якія нібыта абсалютна ні пры чым. Нездарма палякі цяпер змагаюцца за праўду аб Асвенцыме, які ўжо ў Еўропе абвяшчаюць польскім канцлагерам... Тым самым, сёння ўвага акцэнтуецца не на «хваробе» — сутнасці чалавеканенавіснай нацысцкай палітыкі і яе выканаўцах — немцах, а на розных іх памагатых, здрадніках, якія супрацоўнічалі з акупантамі. Пры такім падыходзе асноўныя вінаўнікі трагедыі застаюцца як бы збоку, што зусім не адпавядае гістарычнай праўдзе.

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— Гэта так склалася апошнім часам: калі мы гаворым пра ахвяр, мы пакідаем па-за ўвагай катаў. А трэба казаць і пра іх. Бо ваяваў і чыніў зверствы на гэтай зямлі не нейкі ўмоўны фюрэр, а канкрэтныя людзі — мікрагітлеры. Чаму яны засталіся па-за пакараннем ці панеслі мінімальнае пакаранне?

Вось тут гаварылі аб тым, як палякі ўзяліся ахоўваць нацыянальную памяць. Ці ўспомнім той жа Яд ва-Шэм у Ізраілі, аб якім ведае ўвесь свет. Мы ж застаёмся неяк убаку, і свой боль трымаем у сабе. Сёння чэхі гавораць усяму свету пра трагедыю Лідыцы. Ніколькі не хачу паменшыць маштаб той трагедыі, але ж там расстралялі толькі мужчын, а жанчынам і дзецям далі пэўны шанц выжыць. У хатынскіх дзяцей, у дзяцей соцень беларускіх спаленых вёсак такога шанцу не было. Але хто ў свеце аб гэтым ведае сёння? Хто захоча пра гэта ведаць, калі мы аб гэтым будзем сціпла маўчаць? Гэта той вялікі вельмі красамоўны матэрыял, на якім мы павінны выхоўваць не толькі сваё грамадства, мы маем права на ім выхоўваць міжнародную супольнасць. Усе памятаюць факт, калі канцлер Германіі Вілі Брант у 1970 годзе ў Варшаве стаў на калені перад помнікам паўстанню ў Варшаўскім гета, — гэта лічыцца актам пакаяння. А хто з нямецкіх лідараў стаў на калені ў Хатыні? Хто ўвогуле з нямецкіх лідараў за амаль пяцьдзясят гадоў існавання мемарыяла ў ім пабываў? Хто папрасіў прабачэння, хто пакаяўся перад нашым народам?

**Ірына ВАРАНКОВА:**

— Некалькі дзесяцігоддзяў назад мыназіралі, як у музеі гісторыі вайны некаторыя групы з Германіі, акрамя карт, нічога не цікавіла. Аказалася, гэта тыя, хто ваявалі на баку фашыстаў, прыязджалі паглядзець на «месцы баявой славы»...

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Усё ж якая сёння найперш місія беларусаў у захаванні памяці і праўды пра вайну і яе ахвяр: клапаціцца аб тым, каб пра гэта помнілі і ведаў увесь свет, ці думаць больш пра тое, каб ва ўласным грамадстве, у галовах і душах уласных нашчадкаў гэта памяць і праўда не сказіліся?***

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:**

— Усё гэта, несумненна, узаемазвязана, але я глыбока перакананы, што прыярытэт трэба аддаваць працы з маладым пакаленнем тут, у Беларусі. Мы, несумненна, павінны несці праўду пра жахі той вайны на міжнароднай арэне, але, калі мы ўпусцім выхаваўчы момант тут, ужо праз некалькі дзесяцігоддзяў гэту справу ніхто не працягне. Гэта павінна стаць прыярытэтам для дзяржаўнай сістэмы адукацыі — каб на працягу вучобы кожны наш школьнік абавязкова наведаў знакавыя месцы, звязаныя з той вайной — і з гераізмам, і з трагедыяй — Хатынь, Брэсцкую крэпасць, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя таго, працаваць з моладдзю неабходна і на мясцовым матэрыяле — гэта ўжо адказнасць настаўнікаў і краязнаўцаў.

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— Канешне, перш за ўсё трэба працаваць тут, у Беларусі. У свой час у школах быў асобны падручнік «Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны». Цяпер яго няма, больш за тое — мы ўжо замест «Вялікая Айчынная» пачалі казаць «Другая сусветная». Але ж яна, гэта вайна, у нашай Айчыне, больш чым дзе пакінула свае страшныя сляды... Гадоў пяць назад па просьбе ізраільскага боку мы рыхтавалі інфармацыю аб Хатыні для падручніка, які там выдаваўся. Пасля нам яго даслалі. Вялізная тоўстая кніга, прысвечаная трагедыі яўрэйскага народа ў той вайне. І — асобная старонка, прысвечаная беларускай вёсцы Хатынь. У нашым жа падручніку гісторыі для 10 класа аб хатынскай трагедыі — усяго адзін абзац. А варта было б зрабіць у школах асобны курс, падчас якога гаварылі б не толькі пра перамогі і подзвігі з дэманстрацыяй партрэтаў герояў. Гэта таксама вельмі важна, але гэтага мала. Чаму мы баімся старшакласнікам, студэнтам паказаць жахлівыя фотаздымкі, якія рабіліся або самімі акупантамі, што любілі пазіраваць на фоне спаленых ахвяр, або адразу пасля вызвалення? А яны б сказалі нашмат больш, чым скупыя радкі, што ёсць сёння ў падручніках...

**Ірына ВАРАНКОВА:**

— Сёння варта звярнуць увагу яшчэ вось на што. Мы кажам пра трагедыю беларускіх вёсак, але ж была і трагедыя беларускіх гарадоў, пра якую і сёння няшмат ведаем. Мы ведаем колькасць гарадоў, знішчаных падчас вайны, — 209, але не ведаем і ўжо ніколі, пэўна, не даведаемся, колькі ў іх загінула жыхароў, а ўжо тым больш іх імёнаў. У Мінску, напрыклад, зафіксавана лічба каля 300 тысяч. Але ж там былі і ваеннапалонныя, і бежанцы з іншых месцаў. А колькі загінула карэнных мінчан? І так у кожным горадзе... Хто сёння ведае, што на мінскіх могілках захаваліся магілы ахвяр першых фашысцкіх бамбардзіровак? Можа, варта было б і туды сёння вадзіць экскурсіі?

**Аляксей ЛІТВІН:**

— Я мяркую, што прыйшоў час заняцца перавыданнем ці хоць бы абліčбоўкай кніг «Памяць», і для гэтага патрэбна адпаведная дзяржаўная праграма. Бо дзе, як не ў іх, падаць, зафіксаваць інфармацыю пра тыя чатыры тысячы спаленых вёсак, звесткі аб якіх з'явіліся ўжо пасля падрыхтоўкі да выдання серыі «Памяць». Праца над новай версіяй гэтых кніг або над іх дапаўненнем у віртуальнай прасторы дазволіла б актывізаваць дзейнасць па захаванні гістарычнай памяці на месцах. Гэта павінна стаць адным з прыярытэтаў нашай дзяржаўнай палітыкі, бо мы рызыкуем беззваротна страціць тыя сведчанні, што маем.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:**

— А што датычыцца ўвекавечання тых тысяч спаленых вёсак, то, зразумела, сёння ўжо цяжка даведацца, дзе дакладна знаходзілася тая ці іншая знішчаная вёска, але ў кожным раёне дакладна вядома, якія вёскі на яго тэрыторыі былі спаленыя і не адрадзіліся. Элементарна паставіць у райцэнтры помнік з іх пералікам — і гэта ўжо будзе значны справай у захаванні памяці аб іх.

**Аляксандр ЛІТВІН:**

— Калі ў 70-я гады рыхтавалася серыя «Памяць», многія даваенныя карты, па якіх можна было адсачыць па рэгіёнах, дзе і якія вёскі да прыходу фашыстаў былі засакрэчаныя. Сёння гэтыя карты амаль у вольным доступе, прынамсі для спецыялістаў і яны могуць стаць добрай дапамогай у падрыхтоўцы абноўленай версіі «Памяці».

**Артур ЗЕЛЬСКІ:**

— І не трэба нават ствараць нейкія новыя рэсурсы. У кожнага раёна ёсць свой афіцыйны сайт. На ім можна зрабіць асобную старонку, дзе будзе адкрывацца мясцовая кніга «Памяць» з магчымасцю дадаць інфармацыю. Упэўнены: людзі адгукнуцца. Але павінна быць нейкая ўстанова, якая будзе цэнтралізавана, мэтанакіравана за гэта адказваць.

**Марыя ГАРЭЛІКАВА:**

— І звесткі з кніг «Памяць» можна было б загрузіць у наш інфармацыйны тэрмінал, у раздзел «Спаленыя вёскі», які сёння вельмі запатрабаваны карыстальнікамі.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:**

— Дарэчы, якраз сёлета выдатная нагода і для актывізацыі пошукавай працы на месцах, і для вывучэння трагедый асобна ўзятых паселішчаў у розных куточках Беларусі, і для разгортвання працы па падрыхтоўцы абноўленай друкаванай або абліčбаванай версіі кніг «Памяць» па кожным раёне краіны — Год малой радзімы. Бо менавіта паняцце «малая радзіма» — гэта найперш веданне гісторыі месца, дзе нарадзіўся, і лёсаў людзей, якія жылі і паміралі тут.

**Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## Дарэчы

**У захаванні памяці пра спаленыя вёскі «Звязда» сказала сваё важкае слова — на старонках газеты праводзіўся публіцыстычна-даследны праект «Нашчадкі вогненных вёсак». Гэты праект стаў своеасаблівым працягам кнігі «Я з вогненнай вёскі...» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка, выдадзенай у 1975-м, дзе сабраны і зафіксаваны ўспаміны сведкаў, якія цудам засталіся жывымі. Аўтар праекта Таццяна Падаляк паставіла перад сабой задачу ўжо ў XXI стагоддзі адшукаць апошніх сведкаў нацысцкіх злачынстваў. Адгукнулася больш як 70 сведкаў (у час вайны яны былі дзецьмі і падлеткамі). Актыўны ўдзел у праекце бралі школьнікі, студэнты, настаўнікі, краязнаўцы.**

**Вынікам праекта стала кніга дакументальных нарысаў «Нашчадкі вогненных вёсак», якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Тацціяна Падаляк, аўтар гэтай і яшчэ адной кнігі — «Вайна — самы страшны грэх», атрымала спецыяльную прэмію Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва.**

## Извещение о проведении 25 апреля 2018 года торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)** | Капитальное строение (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад материальный) общей площадью 804,4 кв. м с инв. №613/С-11431, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский рн., Крупский с/с, д. Великая Слобода, Республика Беларусь, на земельном участке с кадастровым номером 623083001101000106 |
| **Начальная цена** | 44 469,90 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 4 446,99 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-05-62 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 25 апреля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 21.03.2018 по 20.04.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».

## Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Жабинковский сахарный завод» за 2017 год. Бухгалтерский баланс на 31.12.2017 года

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | На 31.12.2017 г. | На 31.12.2016 г. |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 193 004 | 143 158 |
| Нематериальные активы | 120 | 151 | 167 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 0 | 0 |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | 0 | 0 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | | |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 18 906 | 30 303 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 434 | 447 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 13 | 11 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 105 | 207 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 95 | 68 |
| **Итого по разделу I** | **190** | **212 708** | **174 361** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 102 495 | 69 433 |
| В том числе: материалы | 211 | 7373 | 4 415 |
| незавершенное производство | 213 | 698 | 0 |
| готовая продукция и товары | 214 | 94 424 | 65 018 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 45 | 4 236 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 1212 | 258 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 18 633 | 29 147 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 27 | 1 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 300 | 2 991 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 0 | 0 |
| **Итого по разделу II** | **290** | **122 712** | **106 066** |
| **БАЛАНС** | **300** | **335 420** | **280 427** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 51 618 | 51 618 |
| Резервный фонд | 440 | 3 | 3 |
| Добавочный фонд | 450 | 45 195 | 34 431 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (3 237) | 54 |
| Целевое финансирование | 480 | | |
| **Итого по разделу III** | **490** | **93 579** | **86 106** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 66 370 | 44 139 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 26 | 34 |
| Доходы будущих периодов | 540 | 23 | 25 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 330 | 359 |
| **Итого по разделу IV** | **590** | **66 749** | **44 557** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 3 540 | 12 703 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 95 577 | 56 099 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 75 927 | 70 944 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 66 170 | 65 407 |
| по авансам полученным | 632 | 4 845 | 1 512 |
| по налогам и сборам | 633 | 580 | 515 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 574 | 623 |
| по оплате труда | 635 | 1485 | 1678 |
| по лизинговым платежам | 636 | 8 | 8 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 278 | 238 |
| прочим кредиторам | 638 | 1987 | 963 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 48 | 10 018 |
| **Итого по разделу V** | **690** | **175 092** | **149 764** |
| **БАЛАНС** | **700** | **335 420** | **280 427** |

### Отчет о прибылях и убытках за январь – декабрь 2016–2017 гг.

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 г. | За январь – декабрь 2016 г. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 164 072 | 195 375 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (147 377) | (148 393) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 16 695 | 46 982 |
| Управленческие расходы | 040 | (6707) | (6119) |
| Расходы на реализацию | 050 | (5530) | (4568) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 4458 | 36 295 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 70 532 | 61 781 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (74 041) | (63 615) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 949 | 34 461 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1134 | 2346 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных организаций | 101 | 202 | 11 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | 8 | 388 |
| проценты к получению | 103 | 6 | 352 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 918 | 1 595 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (791) | (1694) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (25) | (87) |
| прочие расходы от инвестиционной деятельности | 112 | (766) | (1607) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 17 743 | 680 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 16 649 | 0 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 1 094 | 680 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (21 754) | (32 663) |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (9 353) | (7 035) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (12 262) | (25 020) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (139) | (608) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (3668) | (31 331) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (2719) | 3130 |
| Налог на прибыль | 160 | (300) | (668) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | 2 | 0 |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | 0 | 0 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли | 190 | | 0 |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (3) | (244) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (3020) | 2218 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 11 251 | 4204 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | (480) | – |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 7751 | 6422 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | 0 | 0 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | 0 | 0 |

### Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности

**4.** Доля государства в уставном фонде эмитента – 100,0 %, в том числе республиканская – 100,0 % (7 270 175 шт.)

**5.** Количество акционеров всего – 1, в т. ч. юридических лиц – 1, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0; физических лиц – 0, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0.

**6. Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Ед. изм. | За 2017 год | За 2016 год |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 237,67 | 0 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 237,67 | 0 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,0327 | 0 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | х | х | х |
| типа ________ | рублей | 0 | 0 |
| типа ________ | рублей | 0 | 0 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,0327 | 0 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | | | |
| типа ________ | рублей | 0 | 0 |
| типа ________ | рублей | 0 | 0 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 2016 год | х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 23 марта 2017 | х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | не позднее 22 апреля 2017 | х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 12,870 | 11,84 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества, всего | штук | 0 | х |

в том числе: поступившие в распоряжение общества:

| дата зачисления акций на счет «депо» общества | кол-во, шт. | срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества | |
|---|---|---|---|
| | 0 | | |

приобретенные в целях сокращения общего количества акций:

| дата зачисления акций на счет «депо» общества | кол-во, шт. | х | |
|---|---|---|---|
| | 0 | х | х |

**8. Среднесписочная численность работающих (человек) – 847.**

**9.** Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: выручка от реализации сахара без учета НДС за 2017 год составила 164 072 тыс. руб. Удельный вес выручки от реализации сахара без учета НДС в общем объеме выручки от реализации продукции, товаров (работ, услуг) за 2017 год составил 85,2 %.

**10.** Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2017 г.: 20 марта 2018 г.

**11.** Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения: Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг утвержден общим собранием акционеров 24.03.2010 г., «Положение об аффилированных лицах ОАО «Жабинковский сахарный завод» утверждено протоколом Наблюдательного совета от 12.06.2012 г. № 3.

**14.** Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети интернет: www.sahar.by

**Директор** **В. Г. Миронов**

**Гл. бухгалтер** **А. В. Апекунова**

Итоговая часть аудиторского заключения по бухгалтерской отчетности ОАО «Жабинковский сахарный завод» за 2017 год ООО «Грант Торнтон», г. Минск.

### Аудиторское мнение

По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Жабинковский сахарный завод» на 31 декабря 2017 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2017 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

## Бухгалтерский баланс открытого акционерного общества «Белхудожкерамика» г. п. Радошковичи по состоянию на 01.01.2018 года

тыс. руб.

| | На 31.12.2017 | На 31.12.2016 |
|---|---|---|
| **АКТИВ** | | |
| **I. Долгосрочные активы** | | |
| Основные средства | 5910 | 5723 |
| Нематериальные активы | | |
| Вложения в долгосрочные активы | 52 | 40 |
| **ИТОГО по разделу 1** | **5962** | **5763** |
| **II. Краткосрочные активы** | | |
| Запасы | 2106 | 1739 |
| в том числе: материалы | 724 | 331 |
| готовая продукция и товары | 1382 | 1408 |
| Расходы будущих периодов | 3 | 5 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 46 | 1 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 1532 | 1207 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 11 | 339 |
| **ИТОГО по разделу II** | **3698** | **3291** |
| **Баланс** | **9660** | **9054** |
| **ПАССИВ** | | |
| **III. Капитал и резервы** | | |
| Уставный капитал | 483 | 483 |
| Добавочный капитал | 6111 | 6112 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 910 | 882 |
| **ИТОГО по разделу III** | **7504** | **7477** |
| **IV. Долгосрочные обязательства** | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 771 | 773 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **771** | **773** |
| **V. Краткосрочные обязательства** | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 504 | 114 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 122 | 133 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 759 | 557 |
| **ИТОГО по разделу V** | **1385** | **804** |
| **Баланс** | **9660** | **9054** |

### Отчет о прибылях и убытках ОАО «Белхудожкерамика» за 2017 год

тыс. руб.

| **Наименование показателей** | **За январь – декабрь 2017 года** | **За январь – декабрь 2016 года** |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 4716 | 4805 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | (3767) | (3634) |
| Валовая прибыль | 949 | 1171 |
| Управленческие расходы | (615) | (603) |
| Расходы на реализацию | (291) | (300) |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | **43** | **268** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 635 | 373 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | (436) | (427) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 242 | 214 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 13 | 119 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 1 | 108 |
| проценты к получению | | 1 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 12 | 10 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | – | (50) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | | (50) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | | |
| Доходы по финансовой деятельности | | |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | | |
| Расходы по финансовой деятельности | (195) | (131) |
| в том числе: проценты к уплате | (35) | (31) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | (1) | (21) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | (159) | (79) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | (182) | (62) |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** | **60** | **152** |
| Налог на прибыль | (17) | (30) |
| **Чистая прибыль (убыток)** | **43** | **122** |

### Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 01.01.2018

| Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): | | 99,1 |
|---|---|---|
| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
| республиканская | **1 657 435** | **85,7** |
| коммунальная всего: | **259 184** | **13,4** |
| в том числе: областная | **0** | **0** |
| районная | **259 184** | **13,4** |

### Информация о дивидендах и акциях

| **Показатель** | **Единица измерения** | **С начала года** | **За аналогичный период прошлого года** |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | *1028* | 1023 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | *4* | 3 |
| в том числе: физических лиц | лиц | *1024* | 1020 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 15,3 | 27,5 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей (BYN) | 11,66 | 23,3 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | Рублей (BYN) | 0,01 | 0,01 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | Рублей (BYN) | 0,01 | 0,01 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | Рублей (BYN) | 3,88 | 3,87 |

Простые акции, поступившие в распоряжение общества, и простые акции, приобретенные в целях сокращения общего количества, отсутствуют.

### Отдельные финансовые результаты

| **Показатель** | **Единица измерения** | **С начала года** | **За аналогичный период прошлого года** |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 4716 | 4805 |
| Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 4673 | 4537 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения, всего | тысяч рублей | 60 | 152 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 43 | 268 |
| в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | 199 | -54 |
| в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | тысяч рублей | -182 | -62 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 17 | 30 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 43 | 122 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 910 | 882 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 771 | 773 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 273 | 264 |

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: производство керамических изделий культурно-бытового и хозяйственного назначения.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждается годовой бухгалтерский баланс за отчетный 2017 год: 30.03.2018.

Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения: ознакомлены.

■ Слоўніца

# ЧЫЕ ГЭТА ДЗЕЎКІ?

## Пра што можа расказаць родавае прозвішча

**Ці ведаеце вы прозвішча свайго суседа, акрамя таго, што ў пашпарце? Калі вы жывяце ў вёсцы ці захавалі з вёскай нейкія адносіны, прыязджаючы час ад часу туды, хутчэй за ўсё, зможаце расказаць пра яе жыхароў, многія з якіх будуць вашымі сваякамі. Улasна, і адрозніваем мы прадстаўнікоў той ці іншай сям'і па родавых прозвішчах.**

*«Наша вёска Сялец была раней сярэдняй велічыні — у 35 двароў. І жылі ў ёй людзі, якія мелі адны і тыя ж прозвішчы, імёны. І кожнай сям'і былі даны «мянушкі», ці, як казалі, называлі ўсіх па-вулічнаму. Так, ад імені Міхаіл пайшлі Міхасёвы, Міхалкавы, Міхалчыкавы, ад слова Пётр — Пятровы, Петручковы, Пётравы, Пятрусіны»*, — расказвае ў сваім лісце наша **чытачка Яўгенія КУЛЕВІЧ**. І сапраўды, жанчына згадала пра адну з тыповых для Беларусі традыцый — даваць для радзіны адметнае, «кодавае» імя. І сёння вучоныя збіраюць такую каштоўную інфармацыю і нават плануецца з цягам часу выкласці яе ў асобным слоўніку.

— Гэта на самай справе не мянушкі. Родавыя прозвішчы ідуць з пакалення ў пакаленне, там вельмі празрыстая матывацыя і спосаб утварэння, — тлумачыць **Вераніка КУРЦОВА — загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі.** — Напрыклад, Пятрок — гэта ўмоўна адзін з прадстаўнікоў роду, пачынальнік, і ўсіх, хто нарадзіўся ў гэтым родзе, называюць Петраковы. Часам па нейкай прыкмеце, напрыклад, характэрнай для паводзін пэўнай асобы, можа з'явіцца і так званы прыкладзень — прыкладаснае імя. Скажам, у адной сям'і бацька займаўся з тэхнікай, увесь час нешта рамантаваў, і яго празвалі Шурупам, а дзеці ягоныя сталі Шурупчыкам і Гаечкай. Вось гэта сапраўды мянушка, а не родавае прозвішча. Сабраць падобны матэрыял — як родавыя прозвішчы, так і ўласна мянушкі — з усёй тэрыторыі Беларусі даволі цяжка, людзі вельмі далікатна ставяцца да такіх адметных імёнаў-прыкладняў. Часам некаму падаецца, што гэта ганьба, папраўдзе такія імясловы былі тыповымі. «Чые гэта дзеўкі?» — пыталіся ў вёсцы. І адразу разумелі, з якой тыя сям'і, калі атрымлівалі адказ накшталт Базылёвы, Карпавы. І падобныя родавыя прозвішчы, пераважна ад мужчынскага імя, а часам і ад жаночага, утвараліся па ўсёй Беларусі фактычна аднолькава. Яны за некім замацоўваліся, заставаліся нязменнымі, перадаваліся дзецям, унукам. Так захоўвалася генетычная памяць пра род.

І нам хацелася б, каб гэтая інфармацыя была зафіксавана. Зараз традыцыйны сялянскі ўклад, побыт распадаецца ці амаль ужо распаўся. Старэйшае пакаленне, якое ведала дзядоў, бацькоў, адыходзіць. Моцна б'е па традыцыях і пераканцэнтрацыя насельніцтва. Так, людзі, што перяязджаюць, напрыклад, у аграгарадкі, трапляюць у новае асяроддзе, дзе часцей за ўсё няма пераемнасці.

***— Ці не блыталі людзі родавае прозвішча з тым, што запісана ў пашпарце?***

— Традыцыйнае камунікацыйнае вясковае асяроддзе вельмі асаблівае, там людзі жылі спакон веку, наезджых, прышлых было вельмі мала. Прысвоенае імя перадавалася стагоддзямі. Родавае прозвішча было агульнавядомым і арыентаваліся менавіта на яго, тым больш што прозвішча ў пашпарце — з'ява даволі позняя. Але часам такі імясłоў можа стаць і ўласным прозвішчам. Так, у адной з экспедыцый мяне зацікавіла прозвішча — Весяльчак. Аказалася, у вайну ўсе дакументы згарэлі, і калі пасля ў чалавека пыталіся, што запісаць у пашпарце, то прапанавалі скарыстаць слова, якім яго сям'ю і іх папярэднікаў называлі на вёсцы.

У вёсках у розны час праводзіліся традыцыйныя гадавыя і іншыя святы, і маладыя людзі ведалі, куды паехаць, напрыклад, на Васілле, Каляды, Міколу. Дзякуючы гэтаму ўвесь раён, яго насельнікі былі ім звычайна вядомы. І людзі сталага веку таксама не сядзелі на месцы, напрыклад, мне расказвалі, як сваякі ехалі за 20—30 кіламетраў у госці да радзіны на Міхайлу (Міхалле). На Беларусі вельмі шырока, актыўна падтрымліваліся родавыя сувязі як памяць пра продкаў. Людзі своіліся, радніліся — свой быў са сваім.

***— У лісце Яўгенія Барысаўна яшчэ згадала прозвішчы Рымар (ад занятку продкаў), Баручыха (жанчына, якая прыйшла ў вёску замуж з Бараўцаў), Картаплянікі (бацька служыў у пана, які разводзіў розныя сарты бульбы), Дворныя (служылі ў двары). Атрымліваецца, што родавыя прозвішчы расказваюць і аб тым, якія занятkі былі ў людзей.***

— Пераважна родавыя прозвішчы ўтвараліся ад імя бацькі, дзеда, прадзеда. Радзей — ад прозвішча, яшчэ радзей — ад заняткаў ці нейкай характэрнай для пэўнага чалавека рысы. Напрыклад, так было з Немчыкавымі. Нехта ў радзіне перахварэў на адзёр, і гэта адбілася на маўленні: з дзяцінства чалавек не гаварыў. А ў народнай традыцыі тых, хто маўчыць, называлі «немец». Змянілася некалькі пакаленняў, усе іншыя дзеці ў родзе гаварылі, але ўсё адно яны засталіся Немчыкавымі.

Картаплянікі — хутчэй было мянушкай, прыкладнем, а пасля замацавалася не толькі за пэўнай асобай, але і за ўсім родам. Наогул слова «картопля» (і ўсе вытворныя ад яго) тыповае для паўднёва-заходніх гаворак Беларусі, а картаплянікамі ў асноўным называлі месца, дзе пасадзілі альбо выбралі бульбу.

**«Нехта ў радзіне перахварэў на адзёр, і гэта адбілася на маўленні: з дзяцінства чалавек не гаварыў. А ў народнай традыцыі тых, хто маўчыць, называлі «немец». Змянілася некалькі пакаленняў, усе іншыя дзеці ў родзе гаварылі, але ўсё адно яны засталіся Немчыкавымі».**

Рымарам сталі зваць чалавека, што шыў збрую, быў спецыялістам па вырабе раменнай вупражы. Лексічнымі «сваякамі» гэтага слова з'яўляюцца такія найменні, як шорнік, хамутнік. Зразумела, падобнай справай займалася вельмі абмежаваная колькасць людзей. Далёка не ўсе шылі кажухі, білі валёнкі, апрацоўвалі скуру і рабілі іншыя патрэбныя чалавеку рэчы. Для людзей, якія родам сваіх заняткаў адрозніваліся ад іншых вяскоўцаў, у традыцыйным сельскім побыце існавалі свае імёны — словы, якімі абазначаўся той ці іншы занятак. Адметны ж імясłоў можа сведчыць пра гісторыю, традыцыі не толькі адной сям'і, а і пэўнага рэгіёна. Так, мы адразу разумеем, якія заняткі былі ў Мельнікавых ці Кузняцовых, а яшчэ даведваемся пра маёмасныя магчымасці такіх сем'яў. Зразумела, што млын і кузня не маглі быць у кожнай вёсачцы, хутчэй за ўсё, у тых мясцінах, дзе яны дзейнічалі, існавалі вялікія пасяленні жыхароў. Як бачыце, дзякуючы такім ускосным звесткам можна выйсці на гісторыю населенага пункта. Калі ўнікнуць, што стаць за пэўным родавым іменем, адкрыеш для сябе шмат інфармацыі. Сёння многія цікавяцца сваім генеалагічным дрэвам, хочуць узнавіць звесткі пра свой род, і добра было б, каб людзі высвятлялі, калі і чаму ім далі пэўнае прозвішча, кім быў той чалавек, ад імя якога яно пайшло. На гэтым фарміруецца не проста вусная гісторыя, але і наша генетычная памяць. Калі мы хочам захавацца як прадстаўнікі пэўнага роду, такія рэчы добра было б ведаць.

***— Але чаму ў адной вёсцы існавалі розныя формы аднаго і таго ж імя? Так, у сваім лісце Яўгенія Барысаўна прыгадала, што Паўла маглі называць Паўлюк, Павэлак, Паўлюсь; Івана — Янусь, Яська, Ванюша; Лявона — Лёнюсь, Лявончык.***

— У традыцыйнай вёсцы былі вялікія сем'і. Мала таго, што ў адной сям'і маглі расці два ці тры Іваны (раней не было такога вольнага выбару імя, як сёння, іх давалі, арыентуючыся на святцы), дык яшчэ ў родзе імёны паўтараліся. Каб адрозніць аднаго прадстаўніка роду ад другога, бясспрэчна, існавала гэта нікім не пісаная традыцыйная дыферэнцыяцыя. Таму адзін хлопчык быў Паўлюком, другі Паўлючком. А пазней у якасці адрознага родавага прозвішча магла замацавацца і форма Паўлючковы. У велічэзных вёсках вы маглі б сустрэць Івана, Іваньку, Іванца, Іванюшу, Іванючыка, Іваньчыка, Янука, Янюка, Янучка, Янушка, Яську, Януся. Адзначаюцца і іншыя варыянты імя Іван.

***— Пра што яшчэ могуць расказаць прозвішчы?***

— Аднойчы мне сустрэліся прадстаўнікі роду Долеравых. Пачынаю высвятляць, чаму людзей так па-мясцоваму завуць, і ўсплывае цікавы факт. Пасля рэвалюцыі, недзе ў 1918 годзе, іх бацька ездзіў у Амерыку на заработкі, праз пэўны час вярнуўся і прывёз амерыканскія грошы. І вось ужо сто гадоў усе ў родзе — Долеравы. Адразу ўзнікае пытанне, дзе ж сям'я здабыла па тым часе немалыя грошы, каб выправіцца ў далёкае падарожжа? І аказалася, што чалавек узяў на гэта крэдыт пад заруку сваякоў. Праз такія дробязныя гісторыі можна даведвацца пра нешта новае з жыцця краіны, стасункі людзей, сацыяльны побыт, адносіны.

У адной з вёсак Гомельскай вобласці размаўляю з цікавым дзядком і ўсё чую ад яго пра нейкіх Калдачоў. Аказалася, так празвалі па-мясцоваму людзей, у якіх «прабабка варажыла, калдавала». Калі ж я запыталася, хто на Купалле завої робіць, дзядок адказаў: «Не, тое ведзьмы былі». Вось яна — жывая моўная стыхія. У адной і той жа мясцовасці людзі адрозніваюць тых, хто проста калдуе, і тых, хто займаецца вядзьмарствам (апошняе, атрымліваецца, — большае зло, яно неспрыяльна б'е па ўсіх).

Людзей, дастаткова заможных — па вясковых мерках, празвалі Царыкавымі. Але, заўважце, не Царавымі і не Царовымі, маўляў, яны былі багатыя, як цары, але на ніжэйшым, мясцовым узроўні.

А як было не пацікавіцца, адкуль пайшлі Залманавы і род, які ад іх «адпачаткаваўся», — Залманцы? Аказваецца, яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя, калі бацькі пайшлі запісваць дзіця ў царкву, усе імёны, якія былі ў святцах, акрамя Залмана, іх дзеці ўжо мелі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ** ■



■ Жывы гук

# Эксперымент удаўся

### Хіт Кіпелава «Я свабодны» прагучаў па-беларуску

**Беларускамоўную версію адной з самых вядомых песень Валерыя Кіпелава запісалі фолк-гурт Pawa і артысты Вялікага тэатра оперы і балета Ілья Сільчукоў і Вольга Вашкевіч.**




Кавер у перакладзе беларускага фолк-музыкі Віталя Воранава з'явіўся ў сеціве напярэдадні вялікага юбілейнага канцэрта гурта «Кіпелаў», які адбудзецца 31 сакавіка ў мінскім Палацы спорту. Музычны эксперымент прыязна ўспрынялі як шматлікія прыхільнікі расійскага рок-гурта, так і сам яго лідар. «Прачытанне Pawa мне спадабалася, — зазначае Валерый Кіпелаў, — гэта менавіта той выпадак, калі кавер-версія зроблена якасна».

Са свайго боку, беларускія музыканты расказалі, што для іх запіс кавера стаў вяртаннем у юнацтва. «Калі яшчэ падлеткам я захапляўся рок-музыкай, Кіпелаў быў для мяне постаццю нумар адзін. Я набываў запісы гурта на касетах, меў усю належную атрыбутыку: заплечнік з надпісам «Я свободен», берцы і касуху са скурзаму», — успомніў **Юрый Панкевіч з Pawa**. «Я выдатна памятаю, як па запісах Кіпелава вучыліся тэнары ў нашым каледжы пры кансерваторыі, — дадае **саліст Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі Ілья Сільчукоў**. — Валерый мае бязмежны голас, за якім вельмі складана ўгнацца нават прафесійным оперным спевакам. Але мы дадалі ў сваю версію песні іскрынку — жаночы вакал маёй калегі па тэатры Вольгі Вашкевіч».

Зрабіць свой глыток музычнай настальгіі беларускія прыхільнікі гурта могуць ужо цяпер, паслухаўшы кавер-версію на YouTube. А пазней параўнаць яе з арыгіналам падчас канцэрта 31 сакавіка, дзе гурт прадставіць новы альбом «Звезды и кресты» і, безумоўна, самыя любімыя слухачамі песні.

# Здымкі на вулкане

### Беларускі гурт Iowa зрабіў кліп на новую песню «Падай»



Адметнасць відэа ў тым, што знятае яно было ў пясках і гарах іспанскага вострава Тэнерыфе, — як падкрэсліваюць самі музыкі, «без дэкарацый, камп'ютарных спецэфектаў і графікі, цалкам у натуральным асяроддзі». За пяць дзён гурт разам з рэжысёрам і апаратарам Іванам Траяноўскім паспеў ацаніць і засняць і світанкі, і заходы, і найвышэйшую гару Іспаніі — знакаміты дзейны вулкан Тэйдэ — і, канешне, акіян, у якім артысты як след накупаліся ў адзенні

Як расказала салістка гурта Каця Іванчыкава, гісторыя пра прыгоды трох сяброў нарадзілася ўсяго з аднаго гуку. Проста падчас рэпетыцыі, каб перакрычаць гучную музыку, Каця пачала спяваць толькі «у-у-у-у». Словы ж на новую мелодыю давялося падбіраць амаль год, а знайшліся яны толькі сёлета ў студзені, літаральна перад вылетам у водпуск.

Відэакліп «Падай», выкладзены ў сеціве, паспелі праглядзець ужо больш за 380 тысяч чалавек. А пачуць жывую новыя песні гурта землякі змогуць ужо адносна хутка — 24 мая Iowa дасць вялікі сольны канцэрт «Дрэнна танцаваць» на мінскай пляцоўцы Prime Hall.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Фота: афіцыйны Instagram гурта Pawa і Lisa Sakva ■

Хто каго?

# «Закахаўся Верчын Саўка У спакусніцу-русалку...»

**Што было, было, як паэт пісаў: я чую вакол мільён галасоў.**
**Такім чынам — яны. Для пачатку — мужчынскія, у піўной. За першым столікам: «Мне сёння 30, а адчуваю сябе — як у 18». — «Па-ранейшаму бадзёры і поўны амбіцый?» — «Не, па-ранейшаму без жытла, без сям'і, без грошай...»**
**За другім сталом: «Ну дзе б мне знайсці такую, каб я сказаў: «У ваду!», яна — у ваду, я сказаў: «У агонь!», яна — у агонь, сказаў: «У пасцель!», яна ўжо там. «І навошта яна табе ў пасцелі — мокрая ды абгарэлая?..»**
**І з-за трэцяга століка два дзяды вылазяць: «Бач, ад куфля піва ап'янеў, як ад пляшкі гарэлкі», — па дарозе ў прыбіральню скардзіцца адзін. «Так, браце, так: няма таго, што раньш было, — падтрымлівае яго другі. — Я во таксама... Некалі гэту цацку схаваць не мог, а зараз — знайсці».**
**Зрэшты, хопіць. Бо навошта нам нейкія абстрактныя размовы, калі ў пошце столькі канкрэтных — паміж русалкай і жанчынай.**



«Што мы ведаем пра першых, — сама ў сябе пытаецца **спадарыня Галіна Пятроўская з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна** і сама ж адказвае: — Ведаем, што ў мінулым жыцці яны былі звычайнымі дзяўчатамі, маладзіцамі, якім не пашчасціла ў каханні, з-за чаго і патапіліся — пайшлі ў лепшы свет. Але ж, як высвятляецца, не канчаткова, бо час ад часу вяртаюцца. І аб чым тады размаўляюць — жанчына міфічная з жанчынай зямной? Ды вядома ж, пра сваё, жаночае!» На думку **спадарыні Галіны,** русалка зараз скардзіцца:

*— Я ў мароз без паліто —*
*Слёзы капаюць.*
*Не кахае аніхто —*
*Толькі лапаюць.*

Толькі праўда, тое праўда: яшчэ і добрай прыкметай лічыцца пагладзіць, патрымаць тую ж русалку...

Самі ведаеце, за што. Хоць формы там і не вельмі: чараўніца нават тлумачэнне прыдумала, у тым ліку — для жанчыны:

*— Не глядзі на мяне,*
*Што я худаватая:*
*У рэчцы сала не даюць —*
*Я не вінаватая.*

На беразе з гэтым прадуктам, як выглядае, прасцей? А таму, паводле **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў,** жанчына з роварам зараз прамаўляе:

*Не злавіць табе, наяда,*
*Хлопца маладзенькага.*
*Я ж —*
*другога целаскладу —*
*Еду ад міленькага.*

Чаму па снезе на ровары і чаму прыпынілася, ведаюць, па-першае, **спадарыня Наталля Шкут з вёскі Прудок, што на Светлагоршчыне:**

*Глянь — сустрэліся дзве*
*«лэдзі»...*
*Але ж, мусіць, «хворыя»:*
*Адна ў снег*
*на «лісапедзе»,*
*А другая — голая,*

па-другое — **спадар Іван Сіманёнак з Пастаў:**

*Ля скульптуры над вадой*
*Любка тармазнула,*
*Між наядай і сабой*
*Еднасць душ адчула.*
*Прыліла да сэрца кроў,*
*Успаміны — хваляй:*
*— Ну й круціла ж*
*я любоў!..*
*Як цяпер... педалі!*

Трэба разумець, бурная была маладосць, мае жанчына што ўспомніць! (Калі адной такой унучак зранку круціўся, усё казаў: «Маліся і кайся! Маліся і кайся!» Бабуля, бедная, усе грахі свае ўспомніла, перад абразамі ўкленчыла, таблетак напілася. Толькі потым дазналася, што дзіця хацела мультфільм паглядзець — «Малы і Карлсан».)

Героі яго, як вы помніце, любілі адзін аднаго, хацелі бачыцца. Русалка (можна яшчэ раз глянуць на здымак), на думку **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска,** — таксама:

*— Ты каго ж чакаеш*
*На халодным пні:*
*Зранку выглядаеш*
*Удалечыні...*
*Калі ты «забіла» —*
*Не дала нырца,*
*Значыць, палюбіла*
*Хлопца-малайца.*

Магло такое быць? Ну, вядома ж! Сумненні (у **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**) хіба наконт апошняга:

*Затрымалася русалка*
*Ля зімовай снежнай*
*гладзі:*
*Не адзін мужчына палкі*
*Яе позіркамі гладзіў.*
*Угаворваў: заставайся,*
*Хутка скончыцца зіма.*
*Ды няма дзяўчыне шчасця:*
*Снег ляжыць, мужчын —*
*няма.*

Адкуль (ад **спадарыні Валянціны Гудачковай**):

*Сітуацыя на здымку*
*Просіцца ў прыпеўку —*
*Ні заводу кавалераў,*
*Дык сумуюць дзеўкі.*

Ці ўсё ж... высвятляюць адносіны?

З-за чаго? Здагадак у пошце шмат. **Спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў** піша:

*Акунайся ў пельцы дзед:*
*Што маржуе — не сакрэт.*
*Але жонка неяк ціха*
*Асядлала «лісапед»*
*І за мужам —*
*след у след...*
*— Хай таго бадае ліха:*
*Побач — плавае...*
*«маржыха».*

Пра яе ж і **спадарыня Любоў Чыгрынава:**

*Закахаўся*
*Верчын Саўка*
*У спакусніцу-русалку.*
*І наяве, і ў сне*
*Толькі і думак — пра яе!*
*Ну а Верцы што рабіць?*
*Як сям'ю абараніць?*
*Прыдушыла бы*
*з размаху...*
*Шкода гэту расамаху!*

Прычым шкода з самых розных прычын: **сужэнцы Астроўскія з Мінска** дыялог падслухалі:

*— Ты, Русалка, раскажы,*
*Ад чаго нашы мужы*
*Ля цябе ўсё рыбу вудзяць?*
*Можа, вабяць*
*твае грудзі?*
*— Не, у іх палаюць вочы,*
*Калі бачаць стан дзявочы...*
*Пахудзееш,*
*станеш стройнай —*
*Вось тады й*
*жыві спакойна.*

Лёгка сказаць, а вось пахудзець... Роза Львоўна спрабавала — з сябе нешта строіць, але будматэрыялы былі ўжо не тыя.

Іншая справа — русалка... Каля яе «затармазіла» не толькі жанчына з роварам, але і **спадар Аляксандр Матошка з Расонаў:**

*Белы снег, зіма наўкола,*
*Пень і...*
*здань купальская!*
*Прыпыніла цётка колы:*
*«Гэта ж ці не ў казцы я?*
*Добры майстар*
*шчыраваў*
*У дэталях не халтурыў —*
*Плён? Вачэй не адарваць —*
*Ад русалчынай фігуры!*

Пра вочы — усё праўда: спыніцца іх, як лічыць **спадар Аляксандр**, ёсць на чым. Але...

*Вусны, грудзі,*
*стан дзявочы —*
*Хочацца спаткання!*
*Зверху ўніз сігаюць вочы:*
*Хвост?!*
*Расчараванне!..*

А яно, дарэчы, і без хваста можа быць. Расказвалі, жонка адна раней звычайнага з працы вярнулася. Бачыць — дома, у ванне, голая дзеўка. «Хто гэта?» — пытаецца ў мужа. «Ды русалка... Сёння на рыбалцы злавіў», — тлумачыць той. «А чаму без хваста?» — «Вось і я гляджу: без хваста... Значыць, нешта ж з ёю не так?..»

І сапраўды (мае рацыю **спадар Віктар Сабалеўскі**) — трэба разабрацца:

*На падлёдную рыбалку*
*Да Пятра прынесла*
*Клаву,*
*І ўбачыла... русалку.*
*— Вось нягоднік!*
*Абняславіў!*
*Кляўся: рыба не бярэцца,*
*Паплавок без клёву чахне.*
*Адчувала маё сэрца,*
*Што тут іншай*
*«рыбай» пахне.*

Што сказаць гэтай кабеце, чым суцешыць? Хіба радкамі **спадарыні Любові Чыгрынавай:**

*Пагладзіце, як сядзіць*
*Цаца ганаровая...*
*А сукенка хоць*
*блішчыць,*
*Ды зусім хрэновая.*

Карацей, дзвюм жанчынам (на думку **спадара Валерыя Гаўрыша**) абы сустрэцца: яны знойдуць, за што вокам зачапіцца, за што — языкамі, чаму пазайздросціць, за што пасварыцца, аб чым падумаць і, вядома ж, пагаварыць:

*Як сустрэнуцца дзве*
*бабы —*
*Усім сваім дзяліцца рады:*
*— Мой басяк*
*(каб ён так жыў!)*
*Зноў зарплату ўсю прапіў!*
*— Мой не лепшы вадзянік:*
*Сам з зарплатай недзе знік.*

І наогул, як скардзіцца першая, тая, што з роварам: «У дзяцінстве цікавей было: хацелася стаць русалкай, злётаць у космас, завесці сабаку... А зараз усяго і жаданняў, што выспацца, пад'есці і дацягнуць да зарплаты».

Жанчыны, як вядома, трацяць грошы з розумам. У выніку — ні грошай, ні розуму. Таму і варта было б трымацца мужоў, берагчы іх:

*Выява русалкі —*
*усім напамін:*
*З вадой не жартуй,*
*а то... бульк і амін.*

Папярэджваюць аб гэтым **спадарыня Соф'я Кусянкова**, што жыве на Дняпры, **на Рагачоўшчыне**, ды **спадар Мікалай Старых з Гомеля**, з берагоў Сожа. Адтуль, дарэчы, цэлы аповед:

*Русалка хлапца*
*аднаго пакахала,*
*Яму на кручок*
*акунёчкаў чапляла...*
*Прыйшоў на прадвесні*
*ён рыбы здабыць,*
*Не думаў за гэта...*
*жыццём заплаціць.*
*Русалка ад гора*
*тады звар'яцела:*
*Навекі ля берага*
*каменем села.*
*І тым павучае жанок,*
*мацярок:*
*— Сваіх не пускайце*
*на тонкі лядок!*

Трагічная гісторыя, але ж павучальная, бо гінуць людзі з-за гэтай рыбы! Здавалася б, дарослыя, разумныя, цвярозыя, а ўсё туды ж...

Зрэшты, не будзем аб сумным, будзем аб вясёлым. І нават з... калькулятарам у руках: «Летась выйшла восем выпускаў «Хто каго?» — падлічыў шаноўны **спадар Старых.** — У рубрыцы друкаваліся радкі 30 удзельнікаў (сужэнцаў Астроўскіх я лічыў за адну каманду), амаль палова з іх — дэбютанты. Найчасцей і найбліжэй да перамогі (на думку вялікага чытацкага журы) былі **спадарыні Любоў Чыгрынава і Валянціна Гудачкова** (па шэсць разоў), **спадар Валерый Гаўрыш і сужэнцы Астроўскія** — па пяць... Што да саміх пераможцаў, то сярод іх **спадарыні Алена Бажок, Валянціна Гудачкова, Алена Войцік, Соф'я Кусянкова, Вера Жук, спадары Анатоль Гарачоў, Мікалай Старых і Віктар Сабалеўскі...»**

Вас яшчэ не стаміла гэта бухгалтэрыя? Тады яшчэ трохі лічбаў — пра колькасць перамог за... усе гады існавання конкурсу на самы лепшы подпіс да здымка. «Лідар ранейшы, — як вызначыў **спадар Старых, — Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны** з дзесяццю перамогамі, на пятку яму наступае **спадарыня Любоў Чыгрынава** (з дзевяццю). Крыху адстаюць **сужэнцы Астроўскія і Валерый Гаўрыш** (па сем). Шэсць — **у спадарыні Раісы Васільевай...**

Карацей, перафразуючы крылатае *«как же надо любить человека, чтобы взять и приехать к нему!»,* скажам: «Як жа трэба любіць гэты конкурс, каб не проста з пачатку стагоддзя (!) з любоўю сачыць за ім ды пастаянна ўдзельнічаць, але і... весці бухгалтэрыю! Здымаем капялюш, як той казаў, чарговы раз падводзім вынікі.

Такім чынам, найлепшыя радкі пра, скажам так, пераносчыкаў карцін (гл. «Звязда», 7 лютага), на думку вялікага чытацкага журы, склалі **спадарыні Іна Алісевіч з Уздзеншчыны, Любоў Чыгрынава з Мінска, спадары Віктар Сабалеўскі з Узды, Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Мікалай Старых з Гомеля, Мікола Кісель з Мінска ды Іван Сіманёнак з Пастаў.** Вось з гэтым, апошнім меркаваннем, папярэдне павагаўшыся ды паспрачаўшыся, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае.

Такім чынам, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцу газету (на другі квартал 2018 года) накіроўваецца ў Паставы.

Вы хочаце, каб газета прыходзіла і да вас? Тады варыянтаў два: афармляйце падпіску альбо ўважліва глядзіце на ніжні здымак, прыдумвайце подпіс (можна — некалькі, але не больш за восем радкоў) і дасылайце ў рэдакцыю. Шанц на перамогу мае кожны. Спрабуйце!

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**




**Ад яе ж** заўсёдныя шчырыя прабачэнні тым, чые радкі не прайшлі строгага конкурснага адбору. Хоць, як высвятляецца, прымаюць іх не ўсе: спадарыня Я., напрыклад, усё роўна пакрыўдзілася, паведаміла, што болей пісаць не будзе. Чым, вядома ж, засмуціла... І ці толькі нас?

В правилах проведения рекламной игры «Счастливый перевод» ОАО «Белгазпромбанк», опубликованных в № 52 от 17.03.2018 г., правильно читать: «Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3227 от 15.03.2018 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь».





# Збаны купаюцца ў малацэ



**Кераміст з Вілейкі Уладзімір МАТОРАЎ не ўяўляе сваё жыццё без любімай працы. Ва ўтульнай майстэрні Zolak рамеснік стварае з гліны экалагічны посуд і сувеніры. У іх вырабе і апрацоўцы ён выкарыстоўвае толькі натуральныя прадукты: пчаліны воск і малако.**

**З глінай усё зразумела. Гліна ёсць гліна, ляпі з яе што хочаш. На ганчарным крузе Уладзімір спачатку робіць традыцыйны посуд. Але навошта воск і малако? У тым і справа — майстар вырабляе свой посуд у старажытнай народнай тэхніцы малачэння — рэдкай, малавядомай, складанай.**

**— Гліна — вельмі порысты матэрыял і нават пасля абпалу можа прапускаць ваду, — кажа майстар Маатораў. — Таму, стварыўшы збанок альбо кубак, абпаліўшы іх у печцы, патрэбна яшчэ раз іх апрацаваць. Посуд акунаюць у малако і яшчэ раз кладуць у печку. Пасля завяршэння працэсу пакрываюць вадкім воскам. Вынік такой апрацоўкі — гладкія, зручныя і надзіва прыгожыя керамічныя рэчы.**

**Пасля працоўнага дня мы з майстрам з асалодай пілі малако з новенькіх кубкаў, на якіх адбіліся дубовыя лісткі — своеасаблівы сімвал гаспадара майстэрні. Пах адтопленага малака і водар пчалінага воску стварай непаўторную аўру.**

**Ганна ЗАНКАВІЧ, фота аўтара.**
*г. Вілейка.*



**Больш фота пра майстра Уладзіміра Маторава глядзіце на сайце «Звязды».**



■ Здарэнні

# Кідаўся на мінакоў

**У сталіцы супрацоўнік Дзяржаўтаінспекцыі затрымаў мужчыну, які кідаўся з нажом на мінакоў, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.**

Прыблізна ў 17.00 у аператыўна-дзяжурную службу Партызанскага РУУС г. Мінска паступіла інфармацыя аб ДТЗ з удзелам аўтамабіляў «Кіа Сарэнта» і «Пежо 206» на скрыжаванні вуліц Радыяльная і Пераходная. Праз некалькі хвілін стала вядома пра тое, што адзін з кіроўцаў кідаецца з нажом на людзей.

Першым на месца на працягу пяці хвілін прыбыў старшы інспектар ДПС АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска маёр міліцыі Андрэй Парахін. Да яго падышоў адзін з удзельнікаў ДТЗ і сказаў, што кіроўца «Пежо» ўдарыў нажом відавочцу аўтамабільнай аварыі, які праходзіў міма. На месца была выкліканая брыгада хуткай медыцынскай дапамогі, якая даставіла пацярпелага ў медыцынскую ўстанову. Падышоўшы да аўтамабіля «Пежо», супрацоўнік міліцыі затрымаў кіроўцу з выкарыстаннем спецсродкаў. Нажа пры ім выяўлена не было. Ужо пасля затрымання маёр міліцыі выявіў нож у лесапаласе, размешчанай за некалькі метраў ад сутыкнення.

Кіроўцам аўтамабіля «Пежо» быў 47-гадовы мужчына, у крыві якога па выніках медыцынскага агляду аказалася 1,99 праміле алкаголю. Дарэчы, мужчына раней прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення. Яго дзеяннем даецца прававая ацэнка.

# Сужыцеля — нажом у жывот

**У Мінску ў бальніцу з пранікальным раненнем брушной поласці і ў стане моцнага алкагольнага ап'янення быў дастаўлены 30-гадовы грамадзянін Расійскай Федэрацыі. Цялесныя пашкоджанні яму нанесла 34-гадовая мінчанка.**

Па інфармацыі Першамайскага РУУС г. Мінска, мужчына і жанчына былі сужыцелямі паўтара года. У той вечар выпівалі. Падчас такога баўлення часу расіянін пачаў раўнаваць сваю каханую да... мужа апошняй (дама афіцыйна знаходзіцца ў шлюбе з іншым мужчынам), які прысылаў жанчыне СМС-паведамленні. У выніку пачалася бойка. У нейкі момант грамадзянка і нанесла кухонным нажом свайму сужыцелю ўдар у жывот. Заведзена крымінальная справа за наўмыснае нанясенне цяжкага цялеснага пашкоджання. Даме можа пагражаць адказнасць у выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да васьмі гадоў. Раней яна была судзімая за аналагічнае злачынства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Калі табурэт і відэлец становяцца зброяй

**Як напісаў адзін рамантычны аматар выпіўкі: «П'янства — гэта не загана волі, а рух пакрыўджанай душы». Але ўсё часцей выпівоі вызначаюцца не рухамі душы, а рэзкімі выпадамі ўласных рук, якія хапаюць тое, што пад іх трапляецца.**

Пападаецца нярэдка табурэтка, яно і зразумела, бо на ёй сядзіш. Вось толькі нядаўна пісала, як адна кабета ў Баранавічах адлупцавала маладзейшага кавалера не на жарт. Небарака, можа, яшчэ і з бальніцы не выпісаўся, гэта ж не смешкі: табурэткай — па галаве. А ва ўчарашняй зводцы здарэнняў ажно дзве аналагічныя інфармацыі. У Знаменцы Брэсцкага раёна выпівалі два непрацуючыя браты. А потым 33-гадовы пабіў 44-гадовага табурэтам. У Пінску малады сужыцель такой жа мэбляй пабіў старэйшую за сябе жанчыну.

Яшчэ ў адну, зусім не рамантычную гісторыю адносін давялося ўнікаць міліцыянерам у Кобрынскім раёне. Там непрацуючы грамадзянін у п'яным выглядзе так скандаліў з сужыцелькай, што схапіў са стала відэлец і пагражаў яе забіць. Дарэчы, табурэткі і відэлец канфіскавалі як рэчавыя доказы. Не пакідаць жа ім зброю, каб далей біліся.

# Крадуць кароў, коней, цялят

**Брэсцкія міліцыянеры раскрылі групу злодзеяў, якія выкрадалі жывёлу з сельгаспрадпрыемстваў і рэалізоўвалі нарыхтоўшчыкам.**

Апошнія прадавалі мяса ў сталіцы альбо вывозілі ў Расію. Упершыню сігналы з калгасаў паступілі ў міліцыю яшчэ ў канцы мінулага года, калі з калгаснай фермы пачалі прападаць цяляты. І вось на тэрыторыі аднаго з сельгаспрадпрыемстваў Камянецкага раёна супрацоўнікі крымінальнага вышуку затрымалі трох мужчын, калі тыя выводзілі каня са стайні. Зладзеямі аказаліся 18-гадовы хлопец з Маладзечна, раней судзімы за крадзеж, а таксама 33-гадовы і 55-гадовы жыхары Кобрына.

А днямі раскрыты яшчэ адзін крадзеж, паведамілі ў абласным УУС. Гэтым разам карову ўкраў спецыяліст адной з гаспадарак Пінскага раёна. Дома ў яго было знойдзена каля 22 кілаграмаў ялавічыны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

## В процедуре банкротства ООО «АСВАСК» 24.04.2018 в 10.00 состоятся первые торги по продаже имущества ООО «АСВАСК»

Здание колерного цеха, инв. № 350/С-2483, назначение – здание неустановленного назначения, расположено по адресу: Республика Беларусь, г. Гомель, ул. Барыкина, 291В, год постройки – 1974, общая площадь – 1053,7 кв. м, нормируемая площадь – 1053,7 кв. м, нач. цена торгов – 133 000,00 бел. руб. (без учета НДС). Продавец: ООО «АСВАСК» (УНП 100026277). Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036). Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %. Подробная информация об условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://bankrot.gov.by

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе по продаже административного здания, Минская обл., Вилейский район, г. Вилейка, пер. Колхозный, д. 11

Лот № 1. Административное здание с инв. № 631/С-13805. Назначение: здание административно-хозяйственное. Составные части – двухэтажное кирпичное административное здание с холодной пристройкой; Г. п. – 1973; Этажность – 2; Общая площадь – 685,4 кв. м.

**Начальная цена продажи – 162 000,00 бел. руб.**
**Задаток – 16 200,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 621350100005000936, расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11, пл. 6,9912 га. Назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. Земельный участок делимый. Формирование отдельного земельного участка под Объект недвижимости осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) самостоятельно. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Арест. Постановление ИМНС Республики Беларусь по Вилейскому району от 30.12.2016 № 074460. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов)

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен, но не более чем на 20 рабочих дней.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 23.04.2018 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Адм. здание) (Лот № 1), проводимом 23.04.2018 (Молодечненский МРО).

Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 19.04.2018 в 11.00.

Все желающие могут ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: И.о. директора ДУП ПМК-185 Адамович Евгений Викторович, тел. +375 29 170-88-24 с 8.00 по 17.00

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о повторных торгах

Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ЧПУП «Оршатехнострой».

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: лот № 1, объект: грузовой, бортовой.

Наименование, начальная цена, место нахождения: автомобиль «Фиат Дукато», 1999 года выпуска, регистрационный номер AI6769-2, в количестве 1 шт., начальная цена – 5 224,80 рубля, место нахождения – г. Орша, ул. 1 Мая, 129а.

Лот № 2, объект: грузовой фургон.

Наименование, начальная цена, место нахождения: автомобиль Iveco Daily 35S13, 2003 года выпуска, регистрационный номер AI4654-2 в количестве 1 шт., начальная цена – 6 530,40 рубля, место нахождения – г. Орша, пер. 2-й Коммунальный, 2А.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – Декрет Президента Республики Беларусь № 6 от 07.05.2012 г.

Место, дата и время проведения торгов: г. Орша, ул. А. Островского, 36, каб. 12; 13 апреля 2018 г. в 11.00.

Справочная информация: Маханькова Анастасия Александровна, заведующая сектором, тел.: 8 (0216) 543212, 8 (033) 6161412, отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, адрес: ул. А. Островского, 36, г. Орша, адрес электронной почты: opi217@minjust.by.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 12 апреля 2018 г. до 11.00 на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № BY22AKBB36429030007942200000, УНН 300002505, филиал № 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код AKBBBY21215.

Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем).

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», г. Молодечно, ул. Замковая, 19 |

**Предмет аукциона**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Административно-хозяйственное помещение** | 1313,8 кв. м | 630/D-45418 | Минская обл., Молодечненский р-н, **г. Молодечно**, ул. Замковая, 19А/3-1 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 427 444,80 белорусских рублей**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
